Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 МАЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 84 (27942) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Усе эпохі Лошыцы

СТАР. 4

ЧЫРВОНКА



## Яны жылі адной марай — перамагчы!



## Як «расшыфраваць» дождж?

# ПАД МІРНЫМ НЕБАМ МАЯ




Фота БЕЛТА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Расціслаў ЮРЭНЯ, начальнік камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскі метрапалітэн»:**

*«Станцыі трэцяй лініі сталічнай падземкі будуць зручнымі для пасажыраў. Акрамя традыцыйных ліфтаў тут з'явяцца травалатары на перасадачных вузлах. Прыстасаванні арыентавання дазволяць пасажыру ў любым пункце станцыі даведацца, у якім напрамку яму трэба рухацца. Выкананы станцыі будуць у светлых прыродных тонах, граніт на сценах заменіць керамічная плітка. Па трэцяй лініі метрапалітэна будуць курсіраваць цалкам аўтаматызаваныя саставы. Акрамя таго, тут выключаць магчымасць падзення пасажыраў на рэйкі. Для гэтага платформы абсталююць ахоўным экранам, які будзе адчыняцца сінхронна з дзвярыма цягнікоў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.05.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14250,00 | ▼ |
| Еўра | 16030,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 285,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 676,56 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Інавацыі



## СПРАВА НЕКАЛЬКІХ СЕКУНДАЎ

### Нерухомасць пачнуць рэгістраваць дыстанцыйна

**Аб праграме развіцця сістэмы дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй на 2014-2018 гады паведаміў адзін з яе распрацоўшчыкаў, першы дырэктар Нацыянальнага кадастравага агенцтва (НКА), дацэнт кафедры арганізацыі вытворчасці і эканомікі нерухомасці БДТУ Сяргей ШАЎРОЎ.**

### МЫ — У ЛІДАРАХ, АЛЕ ЁСЦЬ ПЫТАННІ

У адпаведнасці з рэйтынгам Doing Business 2015, сістэма дзяржрэгістрацыі ўласнасці, якая дзейнічае цяпер у краіне, займае трэцяе месца ў свеце пасля Грузіі і Новай Зеландыі. Вопыт гэтых краін можна пераняць, а значыць, яшчэ больш удасканаліць існуючую сістэму дзяржаўнай рэгістрацыі правоў на нерухомасць. Так, цяпер уся інфармацыя аб правах на нерухомасць вядзецца ў рэжыме рэальнага часу на ўзроўні лакальных баз даных рэгістра і кожны дзень, але ў цэнтральную базу рэгістра нерухомасці яна трапляе не адразу.

Напрыклад, атрымаць адпаведную інфармацыю з Адзінага дзяржаўнага рэгістра нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй (АДРНМ) можна толькі праз некаторы час пасля рэгістрацыі не толькі тэрытарыяльным агенцтвам па дзяржрэгістрацыі і зямельным кадастры, напрыклад, у Ашмянах, але і ў Мінску. «Гэта не так страшна, але і не вельмі зручна. Таму што закон абвяшчае, што Нацыянальнае кадастравае агенцтва (НКА) за выдачу недакладнай інфармацыі нясе матэрыяльную адказнасць», — сказаў Сяргей Шаўроў.

СТАР. 3

■ Найноўшая гісторыя

## Брама ў Еўропу... І не толькі

### Удзел Беларусі ў адноўленым Шаўковым шляху прынясе краіне мільярды інвестыцый, новыя вытворчасці і працоўныя месцы

**Караваны з дзясяткаў і сотняў вярблюдаў, нагружаных шоўкам, фарфорам, касметыкай, чаем, рысам і іншымі кітайскімі эксклюзіўнымі таварамі, цягнуліся ў бок Еўропы яшчэ да наступлення нашай эры. Пасля заваёўніцкіх паходаў Аляксандра Македонскага Захад даведаўся пра Усход і абодва вырашылі, што нядрэнна было б пагандляваць — кожны тым, што мае. Так і з'явіўся Вялікі шаўковы шлях (па назве тавару, які больш нідзе, акрамя Кітая, не выраблялася і таму быў вельмі жаданым у іншых краінах). З-за войнаў ён часта змяняў свой кірунак, выходзіў у мора, зноў вяртаўся на сушу... Але заўсёды выконваў сваю функцыю — гандлёвая сувязь дзвюх частак матэрыка. Прычым з Кітая тады ішлі не толькі тавары, але і тэхналогіі — напрыклад, вырабу паперы і пораху. Гісторыя — штука цыклічная. І вось прыйшоў час, калі Кітай зноў гатовы ісці ў свет. І з таварамі, і з тэхналогіямі. У нашай краіны ёсць шанц заняць годнае месца ў новым Шаўковым шляху, знаходзячыся на сумежжы двух вялікіх рынкаў — Еўропы і ЕАЭС. Менавіта таму і быў створаны беларуска-кітайскі індустрыяльны парк «Вялікі камень». На наступным тыдні яго наведае старшыня КНР Сі Цзіньпін.**

### ПАЛІТЫЧНАЯ ГАРАНТЫЯ

Наведванне індустрыяльнага парка з'яўляецца адным з найважнейшых пунктаў праграмы дзяржаўнага візіту кіраўніка Кітая ў Беларусь. Гэта падзея стане, хутчэй за ўсё, вельмі моцным штуршком для інвестараў, якія дагэтуль ваגаліся наконт удзелу ў беларуска-кітайскім парку.

СТАР. 3

■ Парламенцкі дзённік

# ВЫВАД З ЦЕНЮ

## Дэпутаты прынялі да ведама Дэкрэт №3 аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства

**На чарговым пасяджэнні сёмай сесіі Палаты прадстаўнікоў дэпутатам былў прадстаўлены Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 года №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства». Дэкрэт, у адпаведнасці з Канстытуцыяй Беларусі, павінен быць разгледжаны абедзвюма палатамі парламента. Акрамя таго, і дэпутаты, і сенатары, ды і ўсе грамадзяне нашай краіны яшчэ да канца гэтага года могуць унесці прапановы па карэкціроўцы гэтага дакумента.**

Дэкрэт выдадзены ў мэтах стымулявання працаздольных грамадзян да працоўнай дзейнасці і папярэджання сацыяльнага ўтрыманства. Але самая галоўная праблема, якую закліканы вырашыць Дэкрэт, — легалізацыя працоўнай дзейнасці. Гэта асабліва падкрэслівала ў размове з журналістамі **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА,** якая прадстаўляла дакумент дэпутатам.

Міністр заклікала дэпутатаў не выкарыстоўваць ярлык «дармаед», а акцэнтаваць увагу выбаршчыкаў на сацыяльнай адказнасці кожнага жыхара нашай краіны. Парламентарыі, у сваю чаргу, адзначылі неадназначную рэакцыю грамадства на прававое новаўвядзенне.

— Камісія па працы і сацыяльных пытаннях дасканала вывучыла пытанні, заўвагі і прапановы, якія паступілі ў парламент, а таксама меркаванні, якія былі выказаны ў СМІ, у тым ліку блогерамі ў інтэрнэце, — паведаміла **намеснік старшыні парламенцкай камісіі Ларыса БАГДАНОВІЧ.** — Часцей за ўсё пытанне выплаты збору хвалюе тых, хто пражывае або працуе за мяжой, даглядае дзяцей, старых, інвалідаў, а таксама часткова занятых, рамеснікаў, жыхароў сельскай мясцовасці і невялікіх гарадоў, тых, хто займаецца хатняй гаспадаркай. Большасць гэтых катэгорый дэкрэтам вызвалена ад выплаты збору. На жаль, значная частка пытанняў датычыцца ценявой занятасці, а значыць, ляжыць у плоскасці працоўных, падатковых, адміністрацыйных і іншых парушэнняў. Разам з тым афіцыйна занятае насельніцтва лічыць дэкрэт своечасовым і карысным для аднаўлення каштоўнасці працы і працоўнага чалавека, а таксама для аднаўлення канстытуцыйнай справядлівасці пра роўнасць перад Законам.

— Лічу правільным, што ад падатку вызвалены тыя, хто трапіў у складаную жыццёвую сітуацыю, у прыватнасці, людзі з абмежаванымі магчымасцямі і сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, — выступіла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Зінаіда МАНДРОЎСКАЯ.** — Але, каб ніводзін чалавек не быў незаслужана пакрыўджаны, у дэпутатаў ёсць магчымасць прапанаваць змены ў гэты дэкрэт. У тым ліку па пытанні, якое шырока абмяркоўваецца, — па вызваленні ад выплаты збору маці, якія выхоўваюць дзяцей, незалежна ад іх колькасці.

**Дэкрэт мае часовы характар, ён будзе дзейнічаць, пакуль не завершыцца распрацоўка ў нашай краіне інтэграванай разлікова-сэрвіснай сістэмы, якая прадугледжвае наяўнасць у кожнага жыхара Беларусі электроннай карткі з інфармацыяй пра яго ўдзел у фінансаванні дзяржаўных выдаткаў.**

Марыяна Шчоткіна таксама звярнула ўвагу на тое, што кіраўнік дзяржавы чарговы раз даручыў дасканала прааналізаваць усе прапановы, якія паступаюць з нагоды дэкрэта.

— Канешне, мы аналізуем, але на жаль, пакуль няма ніякай канкрэтыкі, — паскардзілася яна.

Акрамя пытання, якое тычыцца догляду дзяцей, паступіла прапанова вызваліць ад збору медыятараў. Закон прадугледжвае, што медыятарам можа быць любы чалавек з вышэйшай адукацыяй, які атрымаў адпаведную падрыхтоўку і ўнесены ў рэестр. Яшчэ адна прапанова датычыцца жыхароў не толькі сельскай, але і гарадской мясцовасці, якія жывуць з працы на ўласным падворку.

«Ад збору павінны быць вызвалены тыя катэгорыі грамадзян, якія ўдзельнічаюць у працоўнай дзейнасці або ў фінансаванні дзяржаўных выдаткаў, і кожны сам выбірае, якім шляхам тут ісці», — патлумачыла ідэю дакумента кіраўнік міністэрства.

Распрацоўшчыкі дэкрэта адмовіліся ад прапановы прыраўнаваць тых, хто не ўдзельнічае ў фінансаванні дзяржаўных выдаткаў, да абавязаных асоб па Дэкрэце Прэзідэнта №18 аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях. Відавочна, што ўрад выраšыў не наступаць другі раз на адны граблі. «Па-першае, работа павінна прыносіць чалавеку і заробак, і пэўнае задавальненне, — выказала сваю пазіцыю Марыяна Шчоткіна. — Па-другое, чалавек павінен працаваць, а не рабіць выгляд, што працуе. І наўрад ці варта караць наймальніка, прымушаючы яго ўладкоўваць да сябе на працу чалавека, які не плаціць падаткі, і пры гэтым фарміраваць для апошняга правы на пенсію, заробак, адпачынак і іншае».

Практычны алгарытм рэалізацыі Дэкрэта №3 выбудаваны, лічыць міністр. Той, хто прынцыпова не жадае працаваць і ўдзельнічаць у фінансаванні дзяржаўных выдаткаў, а таксама не хоча плаціць збор, будзе пакараны штрафам у памеры ад двух да чатырох базавых велічынь або адміністрацыйным арыштам з абавязковым выкананнем грамадска карысных работ без аплаты.

Дэкрэт мае часовы характар, ён будзе дзейнічаць, пакуль не завершыцца распрацоўка ў нашай краіне інтэграванай разлікова-сэрвіснай сістэмы, якая прадугледжвае наяўнасць у кожнага жыхара Беларусі электроннай карткі з інфармацыяй пра яго ўдзел у фінансаванні дзяржаўных выдаткаў. У залежнасці ад такога ўдзелу, магчыма, і будуць фарміравацца расцэнкі на розныя спецыяльныя паслугі. «Гэта цывілізаваная практыка, якая актыўна выкарыстоўваецца, — запэўніла міністр. — Але гэта — справа будучыні».

Пасля абмеркавання Дэкрэта №3 дэпутаты прынялі яго да ведама і пагадзіліся праз пэўны час прадставіць шэраг сваіх прапаноў па яго карэкціроўцы.

Таксама на ўчарашнім пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў было разгледжана 10 законапраектаў, у тым ліку ратыфікаваны шэраг міжнародных дагавораў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Медыяпрастора

# СФЕРА АСАБЛІВАЙ АДКАЗНАСЦІ

**Учора ў рамках выставы «СМІ ў Беларусі» прайшоў прэс-дыялог «Роля сродкаў масавай інфармацыі ва ўмацаванні беларускай дзяржаўнасці». Як заўважыла, адкрываючы мерапрыемства, міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ, Беларусь — краіна з адкрытай інфармацыйнай прасторай. Акрамя прыкладна 1,5 тысячы нацыянальных СМІ, на тэрыторыі краіны прысутнічае каля чатырох тысяч замежных.**

— Але СМІ павінны развівацца, і кантэнт інфармацыйнай нацыянальнай прасторы — клопат як галоўнага рэдактара, так і кожнага журналіста, — упэўнена міністр інфармацыі.

На прэс-дыялогу прысутнічалі кіраўнікі вядучых СМІ краіны, парламентарыі, навукоўцы, дыпламаты, палітычныя аглядальнікі.

— Тэма, звязаная з сённяшнім прэс-дыялогам, разглядаецца намі як адна з галоўных тэм, як тэма, якая звязана з напрамкамі, агучанымі Прэзідэнтам нашай краіны ў Пасланні Нацыянальнаму сходу і беларускаму народу, — адзначыла Лілія Ананіч.

Удзельнікі мерапрыемства выказалі свае думкі на розныя тэмы: роля мовы ў дзяржаве і праблема білінгвізму, інфармацыйныя войны ля нашых межаў і спосабы ім супрацьстаяць; разважалі, як не дапусціць падзелу грамадства па рэлігійным або геаграфічным прынцыпе.

Парламентарый **Андрэй НАВУМОВІЧ, старшыня камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі,** які таксама прыняў удзел у прэс-дыялогу, наконт апошняга выказаўся катэгарычна.

— Гэта ўсё нашы людзі. Хачу прывесці ў прыклад вельмі выразнае і яркае выказванне Прэзідэнта нашай краіны: няправільна дзяліць людзей па рэлігійнай ці нейкай іншай прыкмеце: ёсць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пражываюць на нашай тэрыторыі.

У сваю чаргу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ігар МАРЗАЛЮК** падкрэсліў, што беларусы — гэта адзіная грамадзянская нацыя.

— Мы дзяржава, дзе пражываюць людзі з рознымі каранямі. Усе, у каго беларускі пашпарт, хто плаціць падаткі, служыць або служыў ва Узброеных Сілах, — усе гэтыя людзі — беларусы. Незалежна ад паходжання. Гэта нармальны еўрапейскі падыход. Самае галоўнае, што і гісторыкі, і журналісты павінны быць вельмі адказныя за тыя вобразы, міфалагемы, якія яны праецыруюць у сацыяльную рэальнасць.

**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта**, звярнуў увагу на тое, што пасля развалу Савецкага Саюза наша суверэнная краіна прыняла правільныя рашэнні і выбрала правільныя шляхі:

— Мы не дапусцілі хаосу і развалу. Ёсць выразныя рашэнні, прызнаныя грамадствам, заканадаўчай базай, Канстытуцыяй. Роля СМІ — гэта, фактычна, падтрымка той ідэалогіі, якая ўжо закладзена і прынята народам.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

## ЗАХОДЗЬЦЕ: BELSMI.BY




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**У першы дзень выставы «СМІ ў Беларусі» адбылася прэзентацыя партала беларускіх дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі «СМІ Беларусі» (belsmi.by). Як паведаміў на прэзентацыі намеснік галоўнага рэдактара газеты «СБ. Беларусь сегодня» Дзмітрый Партон (на фота), новы сайт даступны ў сеціве з 5 мая. Ініцыятыва стварэння партала належыць Міністэрству інфармацыі. Ідэя заключалася ў падтрымцы ў першую чаргу рэгіянальных СМІ, як друкаваных, так і электронных, і стварэнні адзінай кропкі ўваходу для чытача для азнаямлення з дзяржаўнымі СМІ.**

# УВАГА І ДАПАМОГА

## Сярэдняя пенсія ветэрана складае 4 мільёны 800 тысяч рублёў

**Яшчэ з 2000 года для ветэранаў устаноўлены надбаўкі да пенсіі ў памеры ад 50 да 500 працэнтаў ад мінімальнай пенсіі па ўзросце. У рублёвым эквіваленце гэта ад 183 тысяч да 1 мільёна 843 тысяч. Найбольшыя даплаты атрымліваюць інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны (ім штомесяц дадаткова налічваюць амаль па паўтара мільёна) і Героі Савецкага Саюза (надбаўка ў памеры 500 працэнтаў). Акрамя таго, для людзей, старэйшых за 75 гадоў, прадугледжана даплата да пенсіі ў памеры 75 працэнтаў ад мінімальнай пенсіі па ўзросце, а для тых, хто дасягнуў 80 гадоў, — у памеры 100 працэнтаў. З улікам усіх гэтых надбавак ветэраны атрымліваюць у месяц у сярэднім 4,8 мільёна, што на два мільёны больш за сярэднюю пенсію па рэспубліцы.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Дарэчы, пенсіі за гэты месяц выдадуць датэрмінова. Учора пачаліся выплаты ў аддзяленнях паштовай сувязі Брэсцкай, Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай абласцей і Мінска. На Гродзеншчыне, у Віцебску і сельскіх аддзяленнях Гомельшчыны атрымаць пенсіі можна будзе сёння, а ў гарадскіх паштовых аддзяленнях Гомельскай вобласці — заўтра. 9 мая працаваць будуць толькі дзяжурныя філіялы.

Аднаразовую матэрыяльную дапамогу да 70-годдзя Перамогі на суму 205,5 мільярда рублёў аказалі 44,3 тысячам ветэранаў. Акрамя беларусаў, выплаты, у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі ў галіне сацыяльнага пенсійнага забеспячэння, атрымалі грамадзяне Расіі і Літвы, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі нашай краіны і маюць статус ветэрана.

Як паведаміў **консультант аддзела па справах ветэранаў і інвалідаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег МАЗУРА**, у нас захаваны цэлы блок ільгот для ўдзельнікаў ВАВ. Сацыяльнае абслугоўванне пажылых грамадзян праводзіцца на базе 146 тэрытарыяльных цэнтраў. Дапамогу на даму атрымліваюць чатыры тысячы ветэранаў. Летась ад інвалідаў і ўдзельнікаў вайны паступіла паўтары тысячы заявак на аказанне рознага віду паслуг, напрыклад, па рамонце жылых памяшканняў, надворных пабудоў, печаў. Усе просьбы былі выкананы.

Штогод усе ветэраны праходзяць комплекснае медыцынскае абследаванне, па выніках якога распрацоўваюцца планы індывідуальнай рэабілітацыі. Па словах **галоўнага тэрапеўта Міністэрства аховы здароўя Вольгі МАРШАЛКІ,** да агляду прыцягваюцца супрацоўнікі кафедраў медуніверсітэтаў і Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. У дадатак медсёстры і памочнікі ўрача кожны месяц наведваюць інвалідаў і ўдзельнікаў вайны, каб своечасова скарэктаваць лячэнне.

Сёння ў Беларусі засталося 16 тысяч 800 ветэранаў (на чатыры тысячы менш, чым у мінулым годзе). З іх каля 11 тысяч — інваліды і ўдзельнікі вайны, 4,5 тысячы — узнагароджаныя працаўнікі тылу, 609 чалавек — блакаднікі Ленінграда, 286 грамадзян — работнікі прыфрантавых участкаў чыгункі. Яшчэ 27 тысяч жыхароў нашай краіны лічацца пацярпелымі ад наступстваў вайны.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

# РАЎНАЦЭННАЕ ПАРТНЁРСТВА

## Агульны аб'ём інвестыцый першых рэзідэнтаў парка «Вялікі камень» складзе каля $2 млрд

**Гэтую лічбу, якая адлюстроўвае эканамічнае партнёрства паміж Беларуссю і Кітаем, назваў на сустрэчы з беларускімі журналістамі намеснік начальніка аддзела Дэпартамента краін Еўразіі міністэрства камерцыі КНР спадар Чжан Дун.**



Але ўжо сёння можна гаварыць пра больш значныя паказчыкі супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю. У рамках маючага адбыцца візіту старшыні КНР Сі Цзіньпіна ў Беларусь будзе падпісана больш як 30 дагавораў, тавараварот у рамках якіх складзе 15,7 мільярда долараў ЗША.

— Два важныя для эканомікі нашых краін мерапрыемствы пройдуць у рамках візіту, — гаворыць Чжан Дун. — Першае — кітайска-беларускі эканамічны форум. Мы спадзяёмся, што гэтую падзею заўважыць і прыватны бізнес Беларусі. І другі важны момант — наведванне старшынёй КНР кітайскага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Плануецца, што будуць уручаны пасведчанні аб уваходжанні ў парк першым рэзідэнтам. Агульны капітал іх інвестыцый у «Вялікім камені» складзе 2 млрд долараў.

Магчыма, новаму прыросту інвестыцый будзе садзейнічаць і стварэнне беларуска-кітайскага банка. Пакуль што падчас маючага адбыцца візіту кітайскі бок збіраецца падпісаць з Беларуссю пагадненне аб адкрыцці ў Мінску офіса Кітайскага банка рэканструкцыі і развіцця.

— За гады нашага супрацоўніцтва мы добра вывучылі эканомікі адно аднаго, — адзначыў спадар Чжан Дун. — І хоць Кітай — вялікая краіна, мы глядзім на Беларусь як на раўнацэнная партнёра. Істотную долю імпарту з Беларусі ў нас складаюць калійныя ўгнаенні, хімікаты. Паміж намі існуе панящце ўзаемадапаўняльнасці. Вось зараз канкрэтна прапрацоўваецца пытанне аб пастаўках сухога малака з Беларусі. Цяпер ідуць працэсы ўзгаднення, зацвярджэння сертыфікатаў. І я ўпэўнены, што і ў гэтым напрамку мы прыйдзем да высокага, узаемавыгаднага для абодвух бакоў выніку. Важнае значэнне кітайскі бок надае арганізацыі зборачных вытворчасцяў.

Адна такая зборачная вытворчасць ужо працуе ў Харбіне. Яшчэ дзве правінцыі прадаставяць свае пляцоўкі для новых прадпрыемстваў такога кшталту. Дарэчы, усе з сямі беларускіх рэгіёнаў (шэсць абласцей і горад Мінск) маюць пагадненні аб партнёрстве з канкрэтнымі правінцыямі Кітая. Гэта, безумоўна, з'яўляецца асновай для нараджэння новых планаў, фарміраванні агульнай мазаікі ў стратэгічных задачах эканамічнага партнёрства Беларусі і Кітая.

Вяртаючыся да характарыстыкі кітайскага індустрыяльнага парка ў Беларусі, спадар Чжан Дун адзначыў асаблівасці «Вялікага каменя» перад іншымі падобнымі праектамі. Па-першае, беларускі або мінскі індустрыяльны парк мае самую вялікую тэрыторыю. Па-другое, парк — гэта агульны праект на шляху эканамічнага пояса Шаўковага шляху. Гэта, безумоўна, будзе прыцягваць інвестараў з Кітая і іншых краін у большай ступені. Ужо сёння — і пра гэта таксама ішла размова на сустрэчы беларускіх журналістаў у міністэрстве камерцыі Кітайскай Народнай Рэспублікі — прынята рашэнне аб выдзяленні Беларусі новай крэдытнай лініі. Якім будзе аб'ём гэтага крэдыту — пра гэта стане вядома падчас сустрэчы старшыні КНР Сі Цзіньпіна з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. Эканамічнае партнёрства нашых краін набывае новую дынаміку. Прыемна, што Кітай разглядае Беларусь як надзейнага партнёра, ахвотна абазначае ўзаемавыгадныя прыярытэты ў нашых адносінах.

**Кірыл ЛАДУЦЬКА.**

*г. Пекін, Кітай.*



Фота БЕЛТА.

# Брама ў Еўропу... І не толькі

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Візіт пакажа, якая важнасць надаецца кіраўнікамі дзяржаў гэтаму праекту. Яны пацвердзяць свае намеры. «Укладанні вельмі вялікія, таму неабходны гарантыі. І гэты візіт — самая вялікая палітычная гарантыя, якая толькі можа быць. Увогуле, гэта знакавая для нас падзея. Як кажуць асобныя аналітыкі, некаторыя гадамі просяць, каб гэты ўплывовы кіраўнік прыехаў у іх краіну», — гаворыць **намеснік кіраўніка адміністрацыі індустрыяльнага парка «Вялікі камень» Ігар ЛЯШЧОНАК**.

Напярэдадні візіту актывізаваліся і кітайскія, і беларускія кампаніі, якія збіраюцца заключыць адпаведныя дагаворы аб рэзідэнцтве альбо пагадненні аб намерах рэалізаваць праекты ў парку. «Мы плануем, што падчас наведвання 12 мая кіраўніком КНР індустрыяльнага парка будуць уручаны пасведчанні аб рэгістрацыі ў якасці рэзідэнта шасці ці сямі кампаніям і адбудзецца абмен пагадненнямі аб намерах стаць рэзідэнтамі парка яшчэ з дзесяцю кампаніямі. Гэта адзін з галоўных практычных эфектаў, якія мы чакаем ад візіту Сі Цзіньпіна», — сцвярджае прадстаўнік адміністрацыі.

## БУДАЎНІЦТВА ІНФРАСТРУКТУРЫ

Сёння падрыхтаваны ўсе неабходныя дакументы, таму ў сакавіку былі распачаты будаўнічыя работы: «Размова ідзе пра стартавую зону ў 350 га (3,5 кв. км). Сам парк займае 90 кв. км. Паралельна з гэтым ідзе праца па прыцягненні рэзідэнтаў парка і інвестараў, якія будуць там будаваць свае вытворчыя прадпрыемствы альбо арандаваць гатовыя аб'екты».

Па планах да кастрычніка 2016 года ўся інжынерна-транспартная інфраструктура будзе гатовая. Гэта дарогі, газ, электрычнасць, вада, каналізацыя. «А да пачатку 2017 года мы плануем ужо прапанοўваць у арэнду ці ўласнасць тыпавыя офісныя і вытворчыя плошчы», — паведамляе Ігар Ляшчонак.

## ГАЛОЎНЫ ЭФЕКТ

У першую чаргу сумесны індустрыяльны парк забяспечыць прыток замежных інвестыцый. «Нават па тых дагаворах, якія мы ўжо заключылі і яшчэ плануем заключыць падчас візіту, аб'ём інвестыцый вымяраецца сотнямі мільёнаў долараў, — гаворыць Ігар Ляшчонак. — Калі разглядаць усю тэрыторыю парка, то гэта мільярды долараў, якія мы можам атрымаць у якасці інвестыцый у стварэнне новых вытворчасцяў».

Другі напрамак — прыцягненне новых тэхналогій. Для гэтага будуць стварацца кітайска-беларускія прадпрыемствы. Тут ёсць і зацікаўленасць саміх кітайцаў, бо тады ім прасцей заходзіць на рынак, маючы мясцовага партнёра. А іх сённяшняя палітыка грунтуецца на выхадзе на замежныя рынкі. «Таму мы маем магчымасць стаць для іх плацдармам і атрымаць ад гэтага сваю выгаду. Важныя для нас і льготныя крэдыты, якія ўрад Кітая прадастаўляе нашаму ўраду для стварэння інфраструктуры парка. Такіх умоў фактычна ў свеце няма — доўгатэрміновыя крэдыты на 15 гадоў з пяцігадовым ільготным перыядам, калі мы нічога не плацім, са стаўкай 3% гадавых», — лічыць намеснік кіраўніка адміністрацыі.

Трэці напрамак — кааперацыя ў вытворчасці і стварэнне новых рабочых месцаў. Гэта актуальна ў той сітуацыі, у якой знаходзіцца сусветная і беларуская эканоміка — фазе застою. «Нават на стадыі будаўніцтва інфраструктуры мы бачым эфект. Хоць генеральны падрадчык — кітайская кампанія, яны прыцягваюць беларускія будаўнічыя арганізацыі па субпадрадзе. У будаўніцтве сітуацыя няпростая, а так нашы прадпрыемствы атрымліваюць працу».

Пры гэтым галоўны, канчатковы эфект — «вытворчасць прадукцыі ў буйных аб'ёмах для паставак на вялікі рынак ЕАЭС і еўрапейскі рынак. На гэтых аб'ёмах вытворчасці якаснай высокатэхналагічнай прадукцыі мы будзем зарабляць грошы на падатках і павелічэнні ВУП».

## ПІЯНЕРЫ ПАРКА

У найбліжэйшы час сваю дзейнасць у «Вялікім камені» пачне сусветна вядомая кампанія Huawei. Яна плануе стварыць у парку цэнтр навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх распрацовак для кампаніі ва Усходняй Еўропе. «Яны вызначылі такія перспектывы для нашай краіны і здзіўлены ў сувязі з вялікай колькасці IT-спецыялістаў. Таму яны хочуць стварыць тут «мазгавы цэнтр», — удакладняе Ігар Ляшчонак. Будзе тут працаваць і кампанія ZTE, якая ўжо зарэгістравала прадпрыемства — завод тэлекамунікацыйнага абсталявання.

Яшчэ адзін рэзідэнт парка, які непасрэдна пяройдзе да вытворчасці, — кампанія Zoomlion. Яны плануюць выраб на тэрыторыі парка спецыялізаванай тэхнікі — аўтабетоназмяшальнікаў, аўтакранаў, камунальнай тэхнікі і іншай. Дарэчы, пры гэтым будуць выкарыстоўваць шасі нашага МАЗа.

Адзін з самых буйных праектаў, які знаходзіцца ў стадыі падрыхтоўкі, — стварэнне лагістычнага субпарка. Гэта важна ў кантэксце новага Шаўковага шляху з Азіі ў Еўропу. Рэалізоўваць праект будзе найбуйнейшая лагістычная кампанія Кітая — China Merchants Group — на плошчы ў 100 га недалёка ад аэрапорта. «Мы зможам задзейнічаць не толькі сухапутную частку Шаўковага шляху, але і марскую — запланаваны выхад на Клайпедскі порт, — сцвярджае прадстаўнік адміністрацыі. — Кітайцы не проста так сюды прыйшлі, яны доўга выбіралі маршрут. Праз нас будуць праходзіць велізарныя патокі тавараў з Азіі ў Еўропу і наадварот».

У планах — супрацоўніцтва з кампаніяй YTO, якая выпрабляе трактарную тэхніку. Аднак яна не стане канкурэнтам МТЗ, бо тут будуць стварацца сучасныя сістэмы кіравання для трактароў. Другі этап — у супрацоўніцтве з нашым МТЗ яны прапрацоўваюць пытанне стварэння энерганасычаных трактароў.

А буйная кампанія па вытворчасці оптавалакна Fiberhome Technologies заключыла пагадненне з беларускім ВА «Энергакамплект». Яны хочуць стварыць сумесную вытворчасць оптавалакна.

У доўгатэрміновых планах кампаніі Geely — адкрыццё вытворчасці аўтакампанентаў для таго, каб павысіць лакалізацыю і зменшыць цану машын, якія ўжо выпрабляюцца ў Беларусі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# СПРАВА НЕКАЛЬКІХ СЕКУНДАЎ

## СТВАРАЕЦЦА ЭЛЕКТРОННЫ АРХІЎ

Другім напрамкам удасканалення сістэмы дзяржрэгістрацыі стане больш масавае выкарыстанне электроннай рэгістрацыі. Дзяржаўную рэгістрацыю па такім алгарытме сёння часта праводзяць з удзелам арганізацый Дзяржкаммаёмасці пры ажыццяўленні яе ў працэсе канфіскацыі і прадастаўлення зямельных участкаў. «Такі прынцып дзяржрэгістрацыі быў прапанаваны і судам, але яны ў сілу нацыянальнага характару не карыстаюцца гэтай паслугай», — удакладніў распрацоўшчык новай праграмы.

Справа аб'ектыўна ўскладняецца тым, што да 2010 года ўсе архівы сістэмы дзяржрэгістрацыі вяліся толькі на паперы. І за гэты перыяд быў назапашаны вялікі аб'ём дакументаў. А паэтапны пераход арганізацый па дзяржаўнай рэгістрацыі на вядзенне электроннага архіва пачаўся пяць гадоў таму. На снежань 2014 года ў ім ужо больш за 300 тысяч такіх спраў.

## ПАСЛУГА АЎТАРЫЗАВАНЫХ ПАСЯРЭДНІКАЎ

Цяпер, згодна з палажэннямі заканадаўства, калі кліент прадае ці купляе дачу, то неабходна ехаць і рэгістраваць яе ў адпаведны раён, тлумачыць сітуацыю эксперт. Аднак у новай праграме прадугледжана шырокае ўкараненне працэсу дыстанцыйнай падачы дакументаў для правядзення рэгістрацыі, у тым ліку і з дапамогай аўтарызаваных пасярэднікаў.

Гэта такія асобы, якія па ініцыятыве і даручэнні арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці аказваюць садзейнічанне ў атрыманні гэтай паслугі. Мяркуецца, што такімі асобамі змогуць выступаць і рыэлтары. У гэтым выпадку аўтарызаваны пасярэднік возьме ў заяўніка арыгінал дакумента, адсканує яго, адправіць у орган па дзяржрэгістрацыі, а арыгінал дакумента верне заяўніку. Электронны дакумент павінен быць падпісаны аўтарызаваным пасярэднікам і з'яўляецца доказам у судзе. Акрамя рыэлтараў, аўтарызаванымі пасярэднікамі могуць выступіць галоўныя дактары бальніц, страхавыя кампаніі, банкі, натарыусы і г. д.

**А праз тры гады некаторыя аперацыі па дзяржрэгістрацыі аб'ектаў нерухомасці можна будзе рабіць і ўвогуле за тры секунды.**

Такі прынцып дзяржрэгістрацыі ўжо даўно дзейнічае ў Грузіі і апраўдаў сябе. Там аўтарызаванымі пасярэднікамі выступаюць дамы дзяржаўных паслуг.

## ПАЛІЧЫЦЕ ДА ТРОХ

Плануецца, што да 2018 года не менш за чвэрць заяўнікаў будзе падаваць дакументы для дзяржрэгістрацыі ў электроннай форме. Тады для карыстальнікаў сістэмы дзяржрэгістрацыі распрацоўваюць стварыць і ўкараніць спецыялізаваны сэрвіс «асабісты кабінет». Ён будзе размешчаны на партале НКА. Карыстацца такім «кабінетам» і атрымліваць паслугі, у тым ліку аўтарызаванага пасярэдніка, зможа рыэлтар і любая іншая арганізацыя.

Ужо сёлета на такіх умовах з'явіцца магчымасць зарэгістраваць аб'ект нерухомасці ў рэгістратара за адну гадзіну і нават хутчэй. А праз тры гады некаторыя аперацыі па дзяржрэгістрацыі аб'ектаў нерухомасці можна будзе рабіць і ўвогуле за тры секунды. Напрыклад, дапамогу ў рэгістрацыі дагавора іпатэкі спецыялісту будзе аказваць спецыяльная экспертная сістэма. Яна праверыць інфармацыю аб аб'екце ва ўсіх рэгістрах краіны і, калі не выявіць супярэчнасцяў, павінна будзе прасігналізаваць рэгістратару аб магчымасці рэгістрацыі аб'екта. Шэраг дадатковых паслуг можна будзе атрымаць па электроннай пошце або ў выглядзе SMS-паведамленняў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

**ВІНШУЕМ!**

# Вучыць роднай мове з маленства



**Дзіцячы пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір ЛІПСКІ 6 мая адзначыў 75-годдзе.**

Спадара Уладзіміра можна назваць добрым анёлам нашых дзяцей, які робіць усё магчымае, каб выхаваць у іх павагу да старэйшых, любоў да нашай зямлі і беларускай мовы. Галоўным рэдактарам «Вясёлкі» ён быў прызначаны ў 1978 годзе па рэкамендацыі народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна. Сёння Уладзімір Ліпскі не толькі выдатна кіруе выданнем, але і з'яўляецца заснавальнікам часопіса «Буся», аўтарам шматлікіх кніг, казак, апавесцяў, нарысаў. Дарэчы, менавіта дзякуючы сваім дзецям Уладзімір Сцяпанавіч калісьці пачаў пісаць для самых малых.

На XI Нацыянальным конкурсе друкаваных СМІ «Залатая ліцера» пісьменнік атрымаў узнагароду «За асабісты ўклад у развіццё дзіцячай прэсы».

«Звязда» далучаецца да шматлікіх віншаванняў юбіляру, дзякуе Уладзіміру Сцяпанавічу за плённую творчую працу і жадае, каб у далейшым для яе ствараліся толькі спрыяльныя ўмовы.

# УСЕ ЭПОХІ ЛОШЫЦЫ

## Пасля сямі гадоў рэстаўрацыі адкрылася абноўленая сядзіба



**Сядзібу ў Лошыцкім парку, адзіную, што захавалася ў беларускай сталіцы, можна назваць помнікам рамантычнаму каханню. Калісьці яе гаспадар Яўстах Любанскі для таго, каб ажаніцца са сваёй абранніцай Ядвігай Кіневіч, маладзейшай за яго на сямнаццаць гадоў, вырашыў істотна ўдасканаліць свае ўладанні. Сядзіба зацвіла ў прамым і пераносным сэнсах: ад кахання новай пары і экзатычных дрэў, насаджаных гаспадаром дзеля маладой жонкі...**

Для прыгажуні-нявесты Любанскі перабудаваў сваё жыллё: аднапавярховік ператварыўся ў вытанчаную рэзідэнцыю. Да драўлянага дома XVII стагоддзя быў далучаны новы каменны корпус. Будынак стаў не толькі зручным, але і прыгожым — драўляныя разныя дэталі надалі яму асаблівую эстэтыку. Унутранае аздабленне адпавядала тагачасным уяўленням пра раскошу: сцены былі абліцаваны дубовымі панэлямі, печкі і каміны выклалі надзвычай прыгожай кафляй, якую і сёння можна назваць адной з разыначак гэтага дома.

Колішнія гаспадары мелі добрую фантазію і вытанчаны густ. Кожны пакой быў зроблены ў пэўным стылі. Вестыбюль аформілі на англійскі манер, калідор і лесвіцы — у пампейскім стылі. Афармляючы бібліятэку і сталовую, выкарыстоўвалі элементы рэнесансу, а ў гасцёўнях стварылі адмысловую атмасферу з дапамогай урачыстага ракако.

З часоў Любанскіх не захавалася ні аднаго фотаздымка, які б перадаваў усю колішнюю прыгажосць, ці хаця б неяк намякаў на яе. Аднак рэстаўратары ўсё адно паспрабавалі ўзнавіць інтэр'ер кожнага з тых пакояў: у сучаснай сядзібе іх 14, і ў кожным — свая гісторыя...

Рэстаўратары пастараліся перадаць кожную эпоху, якую перажывала сядзіба. Навуковы супрацоўнік музея Лошыцкай сядзібы Дар'я Латушкіна адзначыла, што ля столі, калі звярнуць увагу, можна заўважыць фрагменты быццам бы шпалераў. Пры аднаўленні такі метад быў выкарыстаны для таго, каб паказаць, як выглядала сядзіба ўжо пасля Ядвігі і Яўстафія Любанскіх. Напрыклад, можна ўбачыць фрагменты таго, якой яна была ў першыя дзесяцігоддзі савецкай улады.



Спецыялісты пастараліся дэталёва ўзнавіць і прылеглую да сядзібы тэрыторыю. З'явілася тут клумба ў выглядзе сэрца — дакладна такую калісьці высадзіла пані Ядвіга. Пра яе трагічны лёс, дарэчы, складзена нямала легендаў. Але, каб даведацца іх і, быць можа, убачыць прывід колішняй гаспадыні, трэба самому завітаць у сядзібу...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**







Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Спажывец

# КАБ НЕ БЫЦЬ ПАДМАНУТЫМ

## Кожны тыдзень каля 10 званкоў з серыі «калі не абважаць, дык аблічаць» пастулае ў інспекцыю Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і Мінску

**Не суцяшаюць і вынікі праведзеных інспекцыяй праверак і маніторынгаў стану вагавымяральных прыбораў пры водпуску тавару спажыўцам на рынках: з 49 правераных у I квартале года гандлёвых аб'ектаў парушэнні выяўлены на 31-м. У «чорны спіс» трапілі індывідуальныя прадпрымальнікі, якія гандлююць на рынку «Кастрычніцкі» ЗАТ «Інвастрой» (г. Мінск), у гандлёвым гарадку «Лебядзіны» ГЦ «Ждановічы» і інш. Парушэнні ўсё тыя ж: неправераная вага, няправільная яе ўстаноўка і размяшчэнне на няўстойлівай аснове, загрувашчванне таварам, што не дазваляе спажыўцу бачыць увесь працэс узважвання і водпуску прадукцыі.**

«Улічваючы значную колькасць выяўленых парушэнняў, скаргі, якія паступаюць ад пакупнікоў, кіраўніцтвам інспекцыі прынята рашэнне аб правядзенні такіх праверак кожны месяц, — паведаміла **намеснік начальніка аддзела дзяржаўнага метралагічнага нагляду інспекцыі Дзяржстандарту па Мінскай вобласці і Мінску Рыта ЧАРКАС.** — Гэта дазволіць навесці парадак у гандлёвых аб'ектах на рынках, засцерагчы грамадзян ад недакладных і няправільных вымярэнняў, а таксама пазбегнуць абважвання і абліку пакупнікоў з выкарыстаннем вагавымяральнага абсталявання».

Са спецыялістамі Інспекцыі Дзяржстандарту па Мінскай вобласці і г. Мінску мы адправіліся на чарговую праверку.

На гэты раз аб'ектам для ўвагі сталі гандлёвыя палаткі з гароднінай і садавіной, якія актыўна гандлююць на вуліцах сталіцы.

...Мы накіроўваемся на бульвар Шаўчэнкі. Тут размясціліся тры гандлёвыя палаткі. У першай — вага механічная, яшчэ савецкіх часоў. Стрэлак не відаць — цэннік налеплены проста на табло. Інспектары тут жа дадаюць: гіры не правераны, вага не ўстаноўлена па ўзроўні, размешчана на няўстойлівых скрынях, што можа прывесці да абліку пакупнікоў. Вага застаўлена таварамі, не мае галаграфічнай наклейкі, якая паказвае пакупніку, што прыбор прайшоў паверку. Дарэчы, у 2015 годзе такая наклейка павінна быць сіняга колеру. На яе наяўнасць варта звяртаць увагу пры здзяйсненні пакупак, асабліва на рынках.

Падышоўшы да другой палаткі, інспектары заўважаюць, што вага выкарыстоўваецца электронная — і для пакупніка гэта больш надзейна. Аднак і тут не абышлося без парушэнняў: вага была не правераная і не мела ніякіх рэквізітаў.

«Адкуль прывезена гэта вага на тэрыторыю краіны — невядома. Яна не ўнесена ў Дзяржаўны рэестр сродкаў вымярэнняў Рэспублікі Беларусь; значыць, яе выкарыстанне не з'яўляецца законным і на паверку яе не возьмуць, — удакладняюць спецыялісты. — Хоць у нас дастаткова шмат афіцыйных зарэгістраваных арганізацый, якія прадаюць вагі, унесеныя ў Дзяржаўны рэестр».

Акрамя гэтага, вага таксама была загрувашчана таварам, устаноўлена на кардонных скрынях.

Не стала ўзорам і трэцяя палатка — тут таксама выяўлены поўны камплект парушэнняў.

Рыта Чаркас удакладняе, што прадавец за невыкананне правілаў карыстання вагай заплаціць штраф, які складае ад 10 да 30 базавых велічынь. А вось за тое, што прымяняецца непаверaная вага, адказвае ўладальнік гандлёвага аб'екта, і яму пагражаюць штрафныя санкцыі ў такім жа памеры.

— Сёння на гэтым пункце нельга будзе працаваць, пакуль вагавымяральнае абсталяванне не заменяць на спраўнае, — дапаўняе інспектар.

На ліквідацыю парушэнняў, як правіла, даюцца суткі.



«Калі пры паўторнай праверцы таксама будуць выяўлены парушэнні, то сума штрафу павялічваецца ўжо ў разы. У далейшым, калі прадпрыемства не ліквідуе парушэнні, адпаведная інфармацыя накіроўваецца па месцы рэгістрацыі прадпрымальніка», — адзначае Рыта Чаркас.

**Дарэчы**

Паверка вагі і гір, якія выкарыстоўваюцца пры ажыццяўленні гандлю і разлікаў паміж пакупнікамі і прадаўцамі, праводзіцца штогод. У рамках гэтай працэдуры пацвярджаюцца метралагічныя характарыстыкі сродку вымярэнняў і яго здольнасць забяспечваць дакладнасць вымярэнняў.

**Дар'я ШОЦІК.**
**Фота аўтара**


**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении 18 мая 2015 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «Торговый Дом «Луч-М»**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-3492 общей площадью 1005 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Тучинский, д. 4 (наименование: Здание торгового дома (литер А 3/К); назначение: здание торгового дома) |
| **Сведения о земельном участке** | площадь – 0,0617 га, кадастровый номер 500000000006005119, назначение – для обслуживания административного здания |
| **Продавец имущества** | ЗАО «Торговый Дом «Луч-М», Тучинский переулок, 4, 220004, г. Минск |
| **Организатор торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)** | 15 128 294 400 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 1 500 000 000 белорусских рублей |
| **Условие торгов (условие продажи)** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. |
| **Наличие обременений** | аренда |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «Торговый Дом «Луч-М», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **18 мая 2015 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 07.05.2015 по 15.05.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);**
**(029)636-70-14 (ЗАО «Торговый Дом «Луч-М»).**

# ЧЫРВОНКА

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

7 МАЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 9 (15768)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года




*Імёны*

## Ганна БЛАГАВА:

# «КАЛІ ВЫЙДУ ЗАМУЖ, ТО НАЗАЎЖДЫ»

**За плячыма гэтай артысткі шматгадовае сяброўства з музыкай. Яна з дзяцінства вывучае яе, спявае і складае свае гісторыі на мове пачуццяў і акордаў. Спрабавала сябе ў такіх конкурсах, як «Славянскі базар», «Еўрафэст», «Новая хваля», а зараз змагаецца на ўкраінскім шоу «Голас краіны». Паралельна працуе ў Тэатры эстрады і ў аркестры Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама, дзе з'яўляецца салісткай. І марыць пра свята сустрэчы са сваімі слухачамі на вялікім сольным канцэрце. Пасля размовы са спявачкай разумееш, што яе асноўнае правіла «цішэй едзеш — далей будзеш» дапаможа гераіні дасягнуць сваёй мэты. Ганна, не зважаючы на ўсю яе сціпласць, умее за сябе пастаяць (між іншым, дзяўчына мае званне прапаршчыка міліцыі), бо свой характар загартоўвала не адзін год, прыехаўшы скараць Мінск з Полацка. Падчас сустрэчы яна расказала пра сваю эмацыянальнасць, стаўленне да мінулага і погляды на будучыню.**

***— Чым абумоўлена ідэя паказаць сябе на «Голасе краіны»?***

— Конкурсы заўсёды ажыўляюць артыста, даюць яму новыя ўражанні і эмоцыі. Павышаецца і інтарэс да саміх выканаўцаў. Рашэнне паўдзельнічаць у «Голасе краіны» прыняла спантанна і яно — чыстай вады авантура. Мой найлепшы сябар Дзяніс Ліс быў запрошаны туды на сляпыя праслухоўванні і прапанаваў скласці яму кампанію. Паехалі. Я была неверагодна ўзрадавана, калі мне патэлефанавалі і сказалі, што мы з Дзянісам прайшлі. Такога я не планавала.

Зараз мне нават у сацыяльных сетках многія задаюць пытаннем: ці не куплены там конкурс? У маім выпадку магу сказаць дакладна, што ўсё было абсалютна сумленна, і я змагла зрабіць там пэўныя крокі сваімі сіламі, бо да мяне добра паставіўся прымаючы бок. Разам з тым людзі маюць рацыю, калі задаюцца пытаннем пра подкупы. На сабе гэта адчула. Заўсёды ёсць тыя, хто можа сабе нешта дазволіць, заручыўшыся падтрымкай, і іх выцягнуць. Я паехала туды з зацікаўленасцю і без страху, а калі самастойна і нечакана для сябе самой прайшла на праект, то конкурс стаў для мяне знакавым.

***— Вы адзначылі, што ідэю паказаць сябе вам падказаў сябар. А ці часта на нашай эстрадзе сустрэнеш шчырую радасць за чужы поспех?***

— Мне складана гаварыць, таму што я не тусоўшчыца, не люблю наведваць месцы, дзе збіраецца бамонд. Людзі вітаюцца, разглядаюць адзін аднаго, а за спінай плююцца. Вельмі не люблю, калі чалавек табе ўсміхаецца, а іншым кажа пра цябе непрыемныя рэчы. Таму, калі і бачуся з калегамі па цэху, то толькі на канцэртах.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*З верай у Перамогу*

# «МЫ ЖЫЛІ АДНОЙ МАРАЙ — РАЗБІЦЬ ВОРАГА...»

**Старшыня Савета ветэранаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Рыгор ПРЫШЧЭПНЫ на фронце апынуўся ў даволі юным узросце — у сямнаццаць. Цяпер Рыгору Васільевічу восемдзесят дзевяць гадоў, сорак з іх ён працуе загадчыкам лабараторыі вышэйшай матэматыкі БДУІР. У размове ветэран узгадаў пра сваю ваенную маладосць і паразважаў пра сённяшніх юнакоў і дзяўчат, з якімі працуе ва ўніверсітэце.**

Украіна і Беларусь — абедзве гэтыя краіны сталі для Рыгора Прышчэпнага роднымі. Нарадзіўся ён на Чаркашчыне, у горадзе Залатаноша. Усе дні праводзіў з сябрамі ў лесе ці на рацэ. Днепр пад Чаркасамі дасягае больш як кіламетровай шырыні, і Рыгор у сёмым класе ўжо пераплываў яго.

— Увесь вольны час мы праводзілі на свежым паветры: збіралі грыбы, гулялі ў «квача» (даганялкі пад вадой), футбол, лапту, — узгадвае Рыгор Васільевіч. — Акрамя таго, навучанне ў школе ў той час было крыху іншым, усіх хлопцаў рыхтавалі да абароны краіны. Мы здавалі нормы ГПА, займаліся фізічнымі практыкаваннямі. У піянерлагерах, куды многія ездзілі на адпачынак летам, вялікая ўвага надавалася патрыятычнаму выхаванню. Шчыра кажучы, некаторыя з навыкаў, якія я атрымаў у тыя часы, пасля спатрэбіліся мне на фронце.

Калі пачалася вайна, ён толькі восем класаў скончыў. У верасні 1943 года, калі хлопцу споўнілася 17 гадоў, быў прызваны ў Чырвоную Армію, у разведку. Магчымасць абараняць сваю Радзіму ўспрыняў як вялікі гонар. Той год стаў пераломным у Вялікай Айчыннай, і хлопец быў упэўнены ў канчатковай перамозе над ворагам.

Рыгор Васільевіч кажа, што вайна адразу ж зрабіла з яго дарослага чалавека. Служба ў войску імгненна навучыла хлопца адказнасці: за свае паводзіны, рашэнні і за жыццё таварышаў.

— Я ні ў якім разе не шкадую, што маё юнацтва прыйшлося на вайну, — канстатуе суразмоўца. — Нават думкі пра гэта не з'яўлялася, пакуль вы не спыталі. Мы жылі адной марай, адным парывам — хутчэй разбіць ворага.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*




Наш герой: не старэюць душой ветэраны!

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

*Справа па душы*

# У РУХУ,

## або Чаго хоча танцор...

**Хто сказаў, што мужчыны не танцуюць? Танцуюць, і яшчэ як! Пра тонкасці сваёй прафесіі распавёў малады харэограф Чачэрскай дзіцячай школы мастацтваў Арцём ГУЛЕВІЧ, які ўжо два гады вучыць «лятаць» дзяцей, моладзь і дарослых. Што прывяло хлопца да танцаў? Будзеце смяяцца, але гэта быў лёс. Этнаграфічны ансамбль з такой назвай ёсць у вёсцы Бабічы Чачэрскага раёна — мясціне, дзе нарадзіўся будучы танцор. Не памылюся, калі скажу, што танцы — фамільны занятак сям'і Гулевічаў: усе дзеці прайшлі праз калектыў «Лёс». Праўда, і брат, і малодшая сястра нашага суразмоўцы памянялі прафесію.**

— Адзін я застаўся, — жартуючы, уздыхае Арцём і ўзгадвае цікавы выпадак. — Аднойчы мы рыхтаваліся да фестывалю беларускіх бытавых танцаў, але я забыўся на адзін з іх. Мой брат разам са сваёй дзяўчынай, якая таксама добра танцуе, стаў і лёгка паказаў мне яго, хаця ўжо пяць гадоў мінула, як ён кінуў гэтым займацца.

Спярша праз школу «Лёсу» прайшоў старэйшы брат Арцёма. Хлопчык пільна сачыў за яго «трэніроўкамі» і зацікавіўся настолькі, што сам пачаў паўтараць і развучваць рухі. У 11 гадоў Арцём прыйшоў у калектыў, дзе яго ўзялі ў малодшую групу. Пасля дзявятага класа хлопцу прапанавалі прадоўжыць навучанне ў Гомельскім дзяржаўным каледжы мастацтваў імя Н.Ф. Сакалоўскага: на той час у Чачэрскім раёне была патрэба ў харэографах. Арцёму зрабілі мэтавае накіраванне. Экзамены ён здаў добра, набраных балаў хапіла на бюджэтнае месца.



Фота Надзеі БУЖАН.

Вучоба ў каледжы зацягнула з першага курса: у дзень магло быць каля шасці гадзін танцаў: народных, класічных, бальных, сучасных, гісторыка-бытавых. Арцём прызнаецца, што нават пасля такіх нагрузак заставаліся сілы хадзіць на... дыскатэкі. З вялікай ахвотай далучыўся ён і да іншага віду мастацтва: на тэатральным аддзяленні каледжа часам не хапала акцёраў, таму ў харэографаў таксама быў шанц стаць «зоркай» пастаноўкі. Пра сябе хлопец пажартаваў: «На дні першакурсніка быў богам, потым царом, а пасля мяне панізілі да графа». Арцёму прапаноўвалі пець і ў хоры «Радзейка», аднак расклад заняткаў не дазволіў ажыццявіцца гэтай задуме. Карацей, у каледжы сумаваць не даводзілася.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
7 05 2015 г.

*Повязь пакаленняў*

# ПЕРАМОГУ СУСТРЭЛІ КВЕТКАМІ

**Пазаўчора з падарожжа па Беларусі, якое расцягнулася на 2 700 кіламетраў, вярнуўся маладзёжны агітпоезд «Кветкі Вялікай Перамогі». Яго пасажырамі сталі актывісты Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, творчыя калектывы. Сустракаць цягнік з кветкамі на перон мінскага чыгуначнага вакзала прыйшло каля тысячы чалавек: моладзь, ветэраны, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў.**



У падарожжа мы адправіліся 24 красавіка, — распавяла **сакратар ЦК БРСМ Вікторыя МЯНАНАВА** адразу пасля спынення цягніка. — Гэта былі неверагодныя дні, на кожнай станцыі нас сустракалі ўсмешкамі і слязьмі радасці мясцовыя жыхары. Думаю, не менш прыемна было і ім, асабліва ветэранам, якія, дзякуючы нашаму цягніку і яго музею, маглі вярнуцца ў той шчаслівы май 45-га. Нас вельмі цёпла сустракалі паўсюль, але асабіста мне добра запомніўся наш прыезд у Скідаль. Мы былі на станцыі ўсяго пяць-сем хвілін, але мясцовыя жыхары сустрэлі цягнік неверагодна прыгожа: з гармонікамі, танцамі і спевамі. Дзяўчаты апранулі паркалёвыя сукенкі, прыйшлі піянеры, актывісты БРСМ. Увогуле, за час паездкі склалася адчуванне, што мы ўжо святкуем Дзень Перамогі; так бы мовіць, 9 мая — кожны дзень.

**«Ад ідэі агітпоезда «Кветкі Вялікай Перамогі» мы не адмаўляемся, будзем прапрацоўваць пытанне аб тым, каб ужо ў наступным годзе ён праклаў свой шлях і ў іншых краінах былога Савецкага Саюза».**

На сваім шляху састаў з сямі вагонаў наведаў месцы баявой славы Чырвонай Арміі ў самых розных гарадах: Асіповічах, Бабруйску, Гомелі, Жлобіне, Магілёве, Оршы, Віцебску, Лідзе, Скідалі, Гродне, Баранавічах, Брэсце. На станцыях удзельнікі паездкі рэканструявалі святкаванне 9 мая ў 1945 годзе, ладзілі канцэрты і творчыя праграмы, паказвалі



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

тэатралізаваныя пастаноўкі, ускладалі кветкі да помнікаў, сустракаліся з ветэранамі.

Адзін з вагонаў цягніка заняў імправізаваны музей, у якім экспанаваліся рэчы ваеннага часу. Падчас падарожжа ён папоўніўся экспанатамі з розных гарадоў Беларусі, фільмамі-ўспамінамі ветэранаў, «Пісьмамі да пераможцаў».

— Як і семдзесят гадоў таму, Вялікая Перамога аб'яднала людзей, — сказаў у сваім прывітальным слове **першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ**. — Сёння вялізная колькасць грамадзян, у першую чаргу маладых, прыкалі свае намаганні з тым, каб рэалізаваць гэты маштабны патрыятычны праект. І я ўпэўнены, што той настрой, які падараваў цягнік жыхарам краіны, застанецца ў іх яшчэ доўга.

— Нам асабліва прыемна, што праект агітпоезда «Кветкі Вялікай Перамогі» ўвасобіла ў жыццё маладое пакаленне, — падкрэсліў **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ**, які таксама прыйшоў сустрэць цягнік на вакзал. — Гэта даказвае, што ў нас вельмі добрая моладзь, якая памятае гісторыю і трапятліва ставіцца да таго, што адбывалася ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Гэта падштурхоўвае да новых ініцыятыў і праектаў для моладзі, прысвечаных не толькі Вялікай Перамозе, але і іншым важным падзеям у гісторыі Беларусі. Дарэчы, і ад ідэі агітпоезда «Кветкі Вялікай Перамогі» мы не адмаўляемся, будзем прапрацоўваць пытанне аб тым, каб ужо ў наступным годзе ён праклаў свой шлях не толькі па Беларусі, але і па тэрыторы іншых краін былога Савецкага Саюза.

Пасля ўрачыстага мітынгу і вальса на Прывакзальнай плошчы моладзь і ветэраны накіраваліся на плошчу Перамогі, дзе ўсклалі кветкі да манумента. Да ўдзелу ў акцыі ў Мінску далучыліся расіяне, удзельнікі аўтапрабегу-медыяэкспедыцыі «Перамога — адна на ўсіх», якая праходзіць зараз па краінах СНД і Заходняй Еўропы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

*Напамін з 45-га*

# МАЙСКІ СІМВАЛ РАДАСЦІ

**Ва ўсіх рэгіёнах краіны стартавала маладзёжная працоўная акцыя БРСМ «Вясна 45-га», падчас якой актывісты арганізацыі высаджваюць кветкавыя кампазіцыі і клумбы ў гонар 70-годдзя Вялікай Перамогі.**



Формай і тэматычным зместам для іх стала сімвалічная кветка Перамогі — яблыневы цвет з чырвона-зялёнай стужкай. Канкрэтнае месца пасадкі клумбаў кожны тэрытарыяльны камітэт БРСМ вызначае самастойна па ўзгадненні з мясцовымі службамі азелянення. Удзельнікі акцыі здымаюць працэс і выкладваюць фатаграфіі ў сацыяльных сетках.

У рамках акцыі «Кветкі Вялікай Перамогі» актывісты БРСМ арганізуюць па ўсёй краіне своеасаблівыя валанцёрскія пасты, на якіх раздаюць усім ахвотным чырвона-зялёныя стужкі і сімвал акцыі — святочныя бутаньеркі, што складаюцца з яблыневага цвету і чырвона-зялёнай стужкі. Яны сімвалізуюць радасць усіх пакаленняў беларусаў у сувязі Днём Вялікай Перамогі.

У Мінскім гарадскім камітэце БРСМ праявілі крэатыўны падыход і спалучылі сучасныя тэхналогіі з сімвалам пераможнага мая 1945-га: у Парку Перамогі прайшоў майстар-клас па нанясенні 3D-малюнкаў у выглядзе чырвона-зялёнай стужкі з яблыневым цветам.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

*Ад вінта!*

# ЯК З ДЗЯЦЕЙ АРГАНІЗАВАЦЬ КАМАНДУ?

**Больш за 150 юнакоў і дзяўчат узялі ўдзел у І Рэспубліканскім злёце студэнцкіх педагагічных атрадаў, які прайшоў на базе Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Зубраня». Яго арганізатарам выступіў Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ.**

Праграма злёту была разлічана на тое, каб у гульнявой форме пазнаёміць удзельнікаў з рознымі формамі і метадамі працы з дзецьмі: як з першых дзён арганізаваць з дзяцей каманду, як пазбегнуць канфліктных сітуацый, як разгледзець і раскрыць патэнцыял кожнага дзіцяці, як рыхтаваць агульналагерныя мерапрыемствы і як з большай карысцю для дзяцей бавіць вольны час. Трэнінгі, заняткі, майстар-класы праводзілі запрошаныя выкладчыкі, супрацоўнікі "Зубраняці" і калегі з маладзёжнай агульнарасійскай арганізацыі «Расійскія студэнцкія атрады».

Усім удзельнікам злёту была дадзена магчымасць прадставіць свой атрад у творчай форме падчас культурна-забаўляльнага мерапрыемства «Ад вінта!», бо адна з галоўных задач злёту — развіццё карпаратыўнай культуры паміж студэнцкімі атрадамі краіны.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

*Працоўны семестр*

# Ёсць пуцёўка ў студатрад!

**Урачыстая цырымонія адкрыцця трэцяга працоўнага семестра 2015 года прайшла на плошчы Дзяржаўнага сцяга Беларусі ў Мінску. У мітынгу прынялі ўдзел больш за 700 юнакоў і дзяўчат з усіх рэгіёнаў краіны — камандзіры і камісары, байцы студэнцкіх атрадаў, а таксама ветэраны студатрадаўскага руху.**

— Для кожнага маладога чалавека, які толькі ўвайшоў у гэтую вялікую сям'ю, працоўнае лета — вельмі адказны этап, таму што ў студатрадзе, па сутнасці, адбываецца станаўленне асобы і загартоўваецца характар. Тут выяўляюцца лідары, якія пазней прыходзяць ужо на іншыя кіруючыя пасады і з поспехам спраўляюцца са сваімі абавязкамі, — падкрэсліў у сваім выступленні **першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ**.



Ён таксама адзначыў, што гэты год адметны святкаваннем 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Таму ўсе ўдзельнікі адкрыцця трэцяга працоўнага семестра ад імя студатрадаўцаў краіны далучыліся да патрыятычнай акцыі «Кветкі Вялікай Перамогі», ініцыяванай БРСМ. У гонар юбілею ўпершыню пад гукі ваеннага аркестра зводны студатрадаўскі хор выканаў «Марш Перамогі», а ў неба ўзняўся сімвал праекта, складзены з гелевых шароў чырвонага, зялёнага і белага колераў.

Нягледзячы на магчымасць круглагадовай арганізацыі занятасці, асноўным перыядам для работы студэнцкіх атрадаў па-ранейшаму з'яўляецца «трэці працоўны», які доўжыцца з 1 мая па 30 кастрычніка. Самы масавы ўдзел чакаецца ў пачатку ліпеня — пасля здачы сесіі. Структуры Рэспубліканскага штаба працоўных спраў вядуць зараз актыўную дагаворную кампанію. Кожны тыдзень у штабах працоўных спраў пярвічных арганізацый БРСМ ва ўстановах адукацыі праходзіць акцыя «Выбіраем студатрад!», адной з задач якой з'яўляецца інфармаванне маладых людзей пра магчымасці працаўладкавання ў час канікул.

Усяго ў трэцім працоўным семестры ў складзе студэнцкіх атрадаў плануецца працаўладкаваць больш як 70 тысяч чалавек, якія будуць шчыраваць як на аб'ектах краіны, так і за яе межамі. Напрыклад, дзякуючы супрацоўніцтву БРСМ з маладзёжнай агульнарасійскай грамадскай арганізацыяй «Расійскія студэнцкія атрады», зводныя беларуска-расійскія атрады будуць працаваць на будаўніцтве аб'ектаў Беларускай АЭС у Астраўцы (на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі) і касмадроме «Усходні» ў Амурскай вобласці (на Усерасійскай маладзёжнай будоўлі).

Што тычыцца заработнай платы, то яе памер будзе залежаць ад профілю студэнцкага атрада і налічвацца за выкананы аб'ём работы. «Яе трэба зарабіць. Ніводны наймальнік не будзе плаціць заработную плату за «проста так», — падкрэсліў **другі сакратар ЦК БРСМ Сяргей КЛІШЭВІЧ.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Падчас урачыстай цырымоніі адбылося ўручэнне сімвалічных пуцёвак на працу камандзірам і камісарам зводных студэнцкіх атрадаў самага рознага профілю: будаўнічага, педагагічнага, сельскагаспадарчага, сэрвіснага, экалагічнага, медыцынскага і навукова-тэхналагічнага.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
7 05 2015 г.



*Законы гумару*

# У кожным фізіку жыве... лірык

**Фізіка — дакладная навука, і таму людзей, якія ёй займаюцца, прынята лічыць сур'ёзнымі. Аднак 41-е па ліку святкаванне Дзён фізіка ў БДУ даказала, што матэматычны склад розуму — не перашкода для гумару і весялосці.**

Святочным дням на фізфаку дала старт антынавуковая канферэнцыя. Заяўкі на ўдзел прымаліся ад усіх ахвотных, а тэматыку дакладаў ніхто не абмяжоўваў. Выкладчык Ігар Цімошчанка стварыў жартаўлівае «Кіраўніцтва па чытанні лекцый»: «Калі сутнасць лекцый зразумелая, тады таямніца дысцыпліны знікае. Студэнту робіцца сумна, і ён перастае хадзіць ва ўніверсітэт». Выкладчык фізфака прапанаваў розныя спосабы, каб ускладніць жыццё студэнтам: «Калі пішаце формулы, стаўце то маленькі, то вялікі Х. Адна з маіх любімых фраз на лекцыях — «Паглядзіце на формулы... якія я ўжо сцёр!».

Пётр Часнакоў, аспірант фізічнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, прыехаў у Мінск спецыяльна, каб выступіць на канферэнцыі. «Было цікава не толькі самому прыняць удзел, але і паглядзець, у якіх напрамках развіваецца гумар беларускіх фізікаў», — расказаў хлопец.

Галоўны прыз (IPod) за найлепшы даклад атрымаў студэнт V курса фізічнага факультэта Павел Орсіч. Ён разглядзеў узаемадзеянне жаночых і мужчынскіх ядраў і на падставе гэтага вывеў «Атамную тэорыю адносінаў». Поспех даклада можна растлумачыць тым, што ў ім была закранута тэма, якая выклікае асаблівы інтарэс у моладзі.




Фота Юліі ПРАКУРАТ.

На наступны дзень адбылася прэс-канферэнцыя з любімымі (і не толькі) выкладчыкамі. Студэнты добра падрыхтаваліся да гэтага мерапрыемства і з вялікім задавальненнем задавалі каверзныя пытанні накшталт «Я ўбачыў у краме кнігу «Квантавая механіка для чайнікаў». А для якога посуду яшчэ можна скарыстаць квантавую тэорыю?», «Колькі вымярэнняў неабходна для апісання фізічнага цела, якое падпарадкоўваецца жаночай логіцы?», «Часам я засынаю на вашых лекцыях і вы мне снiцеся. А што сніца вам?» і іншыя.

Далей студэнты па традыцыі сарвалі першую пару і пайшлі мітынгаваць ва ўнутраны дворык БДУ. «За Ньютона! У імя Лагранжа! Электрон за пратон!» — скандзіравалі фізікі, а выпадковыя мінакі са здзіўленнем за імі назіралі.

Заняткі ў гэты дзень на фізфаку афіцыйна адмянілі, а замест іх у аўдыторыях арганізавалі атракцыёны і бар. Студэнты супернічалі паміж сабой у веданні законаў фізікі, маглі пакінуць запіс на «памятнай парце» ці нават... ажаніцца ў імправізаваным ЗАГСе. На аўкцыёне «Уcляпую» можна было набыць лот і толькі потым даведацца, што ён з сябе ўяўляе. Загадкавая «Палавінка свету» аказалася павязкай на вока, а «Цесная жаночая кампанія» — матрошкай.

Увечары для першакурснікаў прайшоў традыцыйны спектакль-пасвячэнне, неад'емнымі атрыбутамі якога з'яўляюцца не толькі ўрачыстая клятва і выкананне гімна фізікаў «Дубінушка», але і танец канкан, і нумар са свечкамі.

А завяршыліся святочныя дні «капуснікам» гасцей (членаў арганізацыйных камітэтаў Дзён фізіка іншых універсітэтаў). Падтрымаць фізікаў БДУ прыехалі студэнты з Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М.В. Ламаносава, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, Маскоўскага авіяцыйнага інстытута, Маскоўскага фізіка-тэхнічнага інстытута і іншых. Варта адзначыць, што Дні фізіка — гэта традыцыя, якая складвалася па працягу некалькі дзесяцігоддзяў намаганнямі студэнтаў фізфакаў розных універсітэтаў і краін.

**Ганна КУРАК,**
**студэнтка III курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Свая атмасфера*

# НАВІНЫ НА ПЕРАПЫНКУ

## Што замінае стварыць міжуніверсітэцкае тэлебачанне?

**Пра самыя значныя падзеі ў сценах альма-матар сённяшнія студэнты даведваюцца праз інтэрнэт. Бадай, кожны факультэт мае ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакце» сваю суполку «Падслухана», дзе можна прачытаць, як прайшла чарговая «Міс», у каго з выкладчыкаў складана спісаць і колькі каштуе кава ў міні-кавярні на трэцім паверсе. І, тым не менш, навучэнцы ВНУ працягваюць выдаваць свае газеты і выходзіць у радыё- і тэлеэфір на перапынках. Чаму ўніверсітэцкія сродкі інфармацыі па-ранейшаму запатрабаваныя, расказалі ўдзельнікі рэспубліканскага форуму «Студэнцкія СМІ Беларусі», які прайшоў на базе «МІТСО».**




«Селфі» з любімай газетай.

### СТАЦЬ «ЗОРКАЙ» ФАКУЛЬТЭТА

На стэндзе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў — яркая газета «Alma Papera». Летась студэнты заняліся яе рэбрэндынгам і самі распрацавалі новы фармат. Газета настолькі падабаецца навучэнцам, што ўвесь тыраж разбіраецца за 15 хвілін.

— Камусьці выданне можа падацца занадта каляровым, але гэта цалкам адпавядае таму, што хацелі б бачыць нашы студэнты, — кажа **кіраўнік цэнтра маладзёжных праектаў і крэатыўных рашэнняў «Канструктар» пры БДУКМ Анастасія БАТУРА.** — У нас, напрыклад, ёсць рубрыка «Свая атмасфера», дзе чытачу прапануецца зрабіць штосьці самому: напісаць, аб чым марыш, або скласці верш. А ў адным з выпускаў мы намалявалі, як нас бачаць студэнты БДУІР і мы самі.

***— А праблемныя тэксты ў вас друкуюцца? Напрыклад, пра нясмачныя катлеты ў сталоўцы? — жартуем мы.***

— На пачатку года ў нас праходзіць акцыя «+100500 пытанняў рэктару», дзе студэнты могуць пагутарыць з кіраўніком ВНУ пра што заўгодна. Дзякуючы такім сустрэчам праблемы з катлетамі не даходзяць да старонак газеты. Мы аднойчы пісалі, як капітан нашай футбольнай каманды спытаўся ў рэктара, калі ж у іх будзе свая форма. І яна з'явілася — класная, фірменная!

Зараз студэнты «кулька» рыхтуюць спецвыпуск, прысвечаны 70-годдзю Перамогі. Моладзь напісала шчырыя лісты, дзе расказала, якім чынам вайна закранула іх сем'і.

На думку Анастасіі, такія выданні — добры шанц самарэалізавацца не толькі ў межах будучай спецыяльнасці. Напрыклад, тэксты адной са студэнтак БДУКМ заўважылі рэдактары тэатральных парталаў і прапанавалі дзяўчыне пісаць для іх. Плюс універсітэцкія газеты даюць магчымасць падзяліцца нечым важным і стаць на сваім факультэце «зоркай».

Найстарэйшае і самае папулярнае выданне Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта «Alma Mater» выходзіць з 1995 года. Штомесяц газета расказвае пра тое, што адбываецца на факультэтах і асобных кафедрах, праводзіць апытанні сярод чытачоў, каб з улікам іх пажаданняў паляпшаць наступныя нумары. Здымкі рыхтуе ўніверсітэцкі фотаклуб.

— Кожны год у рэдакцыю набіраюць новых людзей, — распавядае **другакурсніца Аня ШЫМЧУК.** — Праца ў студэнцкай газеце дазваляе трапіць на розныя канферэнцыі, лепш пазнаёміцца са сваім факультэтам. Найбольшым попытам у маіх сяброў карыстаюцца публікацыі пра такія мерапрыемствы, як Дзень першакурсніка, «Міс МДЛУ», КВЗ.

**Зараз студэнты «кулька» рыхтуюць спецвыпуск, прысвечаны 70-годдзю Перамогі. Моладзь напісала шчырыя лісты, дзе расказала, якім чынам вайна закранула іх сем'і.**

**Спецыяліст упраўлення выхаваўчай працы з моладдзю БДУ Яўген БАРОЎКА** мяркуе, што студэнцкія газеты сталі ўжо традыцыяй. Тым больш што пісаць у сецыве і для друкаванага нумара — розныя рэчы. На паперы нельга нічога выправіць, гэта накладае адказнасць. А студэнтам па-ранейшаму цікава чытаць універсітэцкія выданні. Факультэты нават просяць павялічыць тыраж (цяпер ён складае дзесьці 50-60 асобнікаў): газета разыходзіцца вельмі хутка.

### ПЕРАДАЙЦЕ ПРЫЗНАННЕ Ў КАХАННІ

Некаторыя ўніверсітэты маюць сваё радыё. Праўда, наладзіць прамы эфір не ва ўсіх атрымліваецца. Студэнты «кулька» прызналіся, што ў іх нават добрых калонак няма: трансляцыі вядуць праз пажарны апавяшчальнік. А вось радыё «FIVE» міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО», якое працуе восем гадоў, выходзіць у прамы эфір кожны будны дзень у першую і другую змену. У камандзе 34 чалавекі: 22 вядучых, 10 дыджэяў і два адказныя за тэкст. На перапынках будучыя юрысты і эканамісты расказваюць пра навіны ВНУ і краіны, знаёмяць з тэатральнымі і кінапрэм'ерамі. Студэнты і выкладчыкі могуць дасылаць віншаванні, прызнанні ў каханні, замаўляць песні на свой густ. Дарэчы, 15 працэнтаў музыкі ў эфіры — кампазіцыі, якія напісалі студэнты.

— З дапамогай радыё студэнцкія аб'яднанні могуць хутка праінфармаваць аб найбліжэйшых мерапрыемствах, — кажа **першакурсніца Анастасія МАРТЫНАВА.** — На сцяне ў сацыяльных сетках гэтыя аб'явы губляюцца, а тут табе кожны дзень пра іх нагадваюць.

Пахваліцца ўласным тэлебачаннем могуць адзінкі.Так, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны пачаў здымаць відэаролікі толькі ў мінулым кастрычніку. За гэтыя паўгода студэнты падрыхтавалі шэсць выпускаў навін. Спачатку інфармацыйны блок доўжыўся дзесяць хвілін, але затым яго скарацілі да шасці: каб не надакучваў. Цяпер здымаюць праграму, прысвечаную 85-годдзю ўніверсітэта. «Скарынаўскіх» тэлевізійнікаў — 15 чалавек. Карэспандэнтамі сталі дзяўчаты з філалагічнага факультэта, а за апаратару — фізікі-матэматыкі.

Студэнцкаму тэлебачанню БДУІР ужо амаль 15 гадоў. **Максім МАКСАК, каардынатар маладзёжнага канала ўніверсітэта,** узгадвае, як на пачатку 2000-х яны манціравалі свой першы ролік на двух відэамагнітафонах. Цяпер тэлебачанне інфармацыйнае і радыёфізікаў, бадай, самае прасунутае: HD-камеры, фірменная ветраабарона на мікрафонах, тэлесуфлёр. Маніторы ў карпусах, на якія транслююцца навіны, упраўляюцца дыстанцыйна. Змайстравалі нават апаратарскую калыску: падстаўку сабралі сталяры, рэйкі замянілі пластыкавымі трубамі для вады, а калёсы знялі са скейтборда. Штомесяц на журналісцкую каманду (18 студэнтаў) выпісваецца прэмія — ад 6 да 10 мільёнаў рублёў.

— Які неабходны набор тэхнікі, каб стварыць універсітэцкае тэлебачанне? Камера, мікрафон (калі хочаце рабіць інтэрв'ю), святло, носьбіт інфармацыі, дадатковы акумулятар і камп'ютар, каб апрацоўваць матэрыял, — кансультуе Максім.

Тэлебачання, якое б расказвала пра навіны ўсіх ВНУ, зараз няма. Канал «Універсітэт-ТБ», які неяк пачалі ствараць на базе БДУ, апошнія паўтара года не працуе, бо яго не фінансуюць. Дый самі ВНУ не праяўляюць ініцыятыву.

### СТУДПРЭСУ ЧЫТАЮЦЬ ЗА МЯЖОЙ

Сёння ў 54 беларускіх ВНУ выпускаецца 131 студэнцкае СМІ. У сецыве зарэгістравана больш за дзве тысячы суполак універсітэтаў.

— Па выніках сацыялагічнага апытання, 98 працэнтаў моладзі давяраюць інтэрнэту. Таму наша прысутнасць у віртуальнай прасторы — гэта не даніна модзе, а неабходнасць, — лічыць **начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Наталля ПШАНІЧНАЯ.**

Студэнцкія газеты і каналы не павінны толькі забаўляць сваю аўдыторыю. Трэба інфармаваць студэнтаў пра важныя падзеі і фарміраваць каштоўнасныя арыенцыры. Сёлета — акцэнты на Год моладзі і 70-годдзе Перамогі.

**Прэс-сакратар Міністэрства адукацыі Юлія ВАНІНА** заклікае часцей перакладаць навіны на англійскую мову:

**Радыё «FIVE» міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО», якое працуе восем гадоў, выходзіць у прамы эфір кожны будны дзень у першую і другую змену.**

— Нас актыўна чытаюць за мяжой. Не толькі ў суседніх краінах і Кітаі, але і ў Амерыцы і Аўстраліі. Просяць студэнтаў перакладаць інфармацыю пра сябе. Не афіцыйныя звесткі пра ВНУ (яны і так прадстаўлены на інтэрнэт-старонцы), а менавіта навіны пра студэнцкае жыццё. Гэта цікава замежнай моладзі. Увогуле, дзейнасць студэнцкіх сродкаў інфармацыі сведчыць, што ва ўніверсітэтах ёсць самакіраванне. У год, калі Беларусь падала заяўку на членства ў Балонскім працэсе, важна, каб навучэнцы ўдзельнічалі ў самакіраванні і расказвалі пра яго на старонках сваіх выданняў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**




У БДУ, акрамя газеты «Універсітэт», выходзіць каля 10 факультэцкіх выданняў.

Фотаздымкі Сяргея НІКАНОВІЧА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
7 05 2015 г.

Знайсці сябе

# З небам на «ты»,

## або Што павінен умець кожны метэаролаг?



Таня дастае тэрмометр, каб змерыць тэмпературу паверхні вады.

**Пры сустрэчы з Таццянай МАЧКОВАЙ размову пра надвор'е вядуць не таму, што гэтага патрабуюць правілы этыкету. Ведаць сітуацыю ў «нябеснай канцылярыі» — яе прафесія. Дзяўчына працуе тэхнікам-метэаролагам першай катэгорыі на Горацкай аграметэастанцыі. Прызнаецца, што сябры сапраўды часта пытаюцца пра прагнозы: «Магу сказаць ім, чаго чакаць у найбліжэйшыя дзень-два, але далей не загадваю».**

Станцыя знаходзіцца на ўскраіне горада. Двухпавярховы будынак стаў утульным толькі некалькі гадоў таму — прывялі ў парадак, калі ў Горках праводзіліся «Дажынкі». Таццяне пашанцавала пераехаць адразу ў аднаўленае памяшканне. Побач з будынкам — метэапляцоўка са спецыяльным абсталяваннем. Паказчыкі надвор'я трэба здымаць кожныя тры гадзіны. Цяпер, праўда, для гэтага не абавязкова абыходзіць усе прыборы: інфармацыя выводзіцца на камп'ютар. На маніторы бачна, колькі ападкаў было за суткі і якая тэмпература паветра. Гэтыя і іншыя даныя метэаролаг запісвае сабе ў кніжку, шыфруе і складае тэлеграму (для звычайнага чалавека яна выглядае як два радкі загадкавых лічбаў), каб даслаць па электронцы сіноптыкам у абласны Гідрамет.

— Калі толькі прыйшла на станцыю, баялася, што не пацягну, — успамінае Таццяна. — Мяне яшчэ папярэдзілі: будзеш рабіць памылкі ці нясвоечасова дасылаць тэлеграму — могуць увесь калектыў прэміі пазбавіць. Таму кожную лічбу па некалькі разоў правяраю.

Дзяўчына скончыла Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках: на агракалагічным факультэце асвойвала спецыяльнасць «Плодаагародніцтва». Па размеркаванні трапіла ў адну з цяплічных гаспадарак Гомеля. Адпрацавала аграномам-аграхімікам два гады і прыехала дадому ў Горкі. Расказвае, што не хацела вяртацца на палі:

— Шукала што-небудзь лепшае. Ніколі б не падумала, што звяжу жыццё з надвор'ем. Але праз знаёмых выпадкова даведалася пра вакансію, вырашыла паспрабаваць. Спадабалася. Вядома, спачатку было складана: шмат лічбаў. Месяц хадзіла на метэастанцыю вучнем, практыкавалася.

**«Мінусы — вядома, начныя змены. Чалавеку, натуральна, спаць хочацца, а табе за надвор'ем сачыць трэба. Нават ноччу кожныя тры гадзіны ты павінен выйсці і глянуць на аблокі».**

Таня паказвае літаратуру, па якой займалася, каб «перакваліфікавацца» ў метэаролага. З цікавага — атлас з каляровымі фотаздымкамі аблокаў. Патрэбны, каб навучыцца «на вока» вызначаць разнавіднасць і вышыню хмар. Хаця на станцыі ёсць для гэтага спецыяльны прыбор, распазнаць аблокі на адлегласці ў дзясяткі кіламетраў яму не пад сілу.

— Плюсы працы? — дзяўчына задумалася. — Шмат вольнага часу. Два дні працую, два — адпачываю. Калі вялікая норма гадзін, то і па тры-чатыры дні дома бываю. Не пасяваю стаміцца. За два з паловай гады толькі адзін раз была ў адпачынку. А мінусы — вядома, начныя змены. Чалавеку, натуральна, спаць хочацца, а табе за надвор'ем сачыць трэба. Нават ноччу кожныя тры гадзіны ты павінен выйсці і глянуць на аблокі. Дый святаў, атрымліваецца, няма. І на 8 Сакавіка, і на Новы год даводзіцца працаваць, калі дзяжурства выпадае.

Мы тым часам просім Таню правесці экскурсію па метэапляцоўцы. Прыйшлося дзяўчыне пераабуваць свае прыгожыя боты: на абцасах туды нельга заходзіць па тэхніцы бяспекі. Пакуль на вуліцы разглядаем «рамонкі» для збору ападкаў і будкі з тэрмометрамі, наш гід прыгадвае, як на пляцоўцы аднойчы пасяліўся... заяц: «Здаровы такі, нават не ведаю, як ён пад агароджу праціснуўся».

**— А ці даводзілася табе працаваць у экстрэмальных умовах?** — пытаюся ў Тані.

— Так. Памятаеш «Хаўер» у сакавіку пазамінулага года? Мая змена якраз на той цыклон прыпала. Мне ў ноч ісці, а на вуліцы снегу — вышэй за мяне. Я, дарэчы, дзяжурыла падчас паўночнага ззяння і сонечнага зацьмення.

Заробак у маладога раённага метэаролага — пад тры мільёны.

— Калі знаёмыя пытаюцца, якая заработная плата, кажу, што стабільная, — усміхаецца дзяўчына. — Па горадзе ў сярэднім дзесці столькі і атрымліваюць.

У вольны час Таня можа парадаваць блізкіх хатнім печывам. Любіць гатаваць кексы, піцу. У выхадныя і ўвечары звычайна ходзіць у кавярню ці на дыскатэку. Горкі — студэнцкі гарадок, таму моладзі ёсць дзе адпачыць. Распыталі Таню пра кошты. Квіток у мясцовы кінатэатр абыдзецца, у залежнасці ад фільма, у 25-50 тысяч рублёў, пакатацца на каньках на Лядовай арэне (пасля «Дажынак» і такая забава ёсць) — 30 тысяч (у гэты кошт уваходзіць і пракат канькоў). Наведванне начной дыскатэкі — ад 30 да 50 тысяч.



Фота Надзеі БУЖАН.

Даведацца пра тэмпературу паветра можна, калі зазірнуць у псіхраметрычную будку.

**— Куды б ты параіла зайсці прыезджай моладзі?**

— У піцэрыю. Нашу піцу ўсе хваляць: такая смачная. У мяне калега на метэастанцыі ў Оршы працуе. Калі прыязджае, заўсёды гэтую кавярню наведвае.

Аграном па адукацыі, дзяўчына некалі марыла стаць педагогам. Нават нізкія заробкі не пужалі. З дзяцінства гуляла ў школу: пасадзіць вакол сябе лялек ды медзведзянят і тлумачыць ім правапіс і табліцу множання. Каб паступіць на настаўніка малодшых класаў, не хапіла аднаго бала, таму пайшла ў сельскагаспадарчую акадэмію. Не хацела год губляць.

На думку дзяўчыны, адказная і карпатлівая прафесія метэаролага падыдзе ўсядліваму чалавеку, які любіць працаваць з лічбамі. Сама Таня мяняць станцыю на іншае месца пакуль не збіраецца:

— Шкада кідаць. Дый, жа, зноў новыя людзі, з якімі трэба наладжваць стасункі. У мяне і бацькі такія, усё жыццё на адным месцы правялі. Маці ў бальніцы больш за 30 гадоў працуе.

Кажуць, выпускнікі геаграфічнага факультэта БДУ, якія атрымалі прафесію метэаролага, у правінцыю не спяшаюцца. Застаюцца пры абласных Гідраметах. «І дарэмна», — мяркуюць вопытныя супрацоўнікі горацкай станцыі. Сапраўднай метэаралогіі можна навучыцца толькі ў раёнах.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*Мінск — Горкі — Мінск.*

# У РУХУ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар «ЧЗ».)*

У інтэрнаце часта ладзілі дыскатэкі, па вечарах збіраліся ў гімнастычнай зале, дзе расцягваліся, паўтаралі і развучвалі рухі, рыхтаваліся да экзаменаў. Выкладчыкі асабліва ганялі будучых харэографаў за паставу, таму многія гадзіны моладзь праводзіла каля станка. Зараз харэограф узгадвае, што было і цяжка, і лёгка. Адны выкладчыкі паказвалі рух усяго раз — і ўсе павінны былі адразу ж улавіць яго і запомніць. За такімі звычайна не паспявалі і «даганялі» ў гімнастычнай зале пасля заняткаў. Іншыя выкладчыкі развучвалі рухі да таго моманту, пакуль апошняму вучню з групы не стане зразумела, і толькі пасля ішлі далей.

**Бачыць штодня шчаслівыя твары дзяцей — найлепшая ўзнагарода для настаўніка. Пра сваіх вучаніц ён з гонарам кажа: «Яны вельмі здольныя, хутка ўлаўліваюць рухі, за занятак могуць развучыць цэлы танец».**

Арцём прызнае: каледж даваў шмат магчымасцяў. Яго аднагрупнік сышоў у стаўрапальскі казачы калектыў. Самому Арцёму не раз прапаноўвалі стаць удзельнікам ансамбля «Харошкі». Але ён вырашыў спачатку давучыцца, а пасля рабіць кар'еру. Хаця на апошнім, чацвёртым, курсе хлопец пачаў падпрацоўваць харэографам у сярэдняй школе вёскі Раманавічы: там ён вучыў дзяцей рытміцы.

— Спачатку было лёгка, бо выхаванцаў было няшмат, — узгадвае Арцём. — Два разы са мной прыязджаў харэограф і тлумачыў, што і як, бо я толкам не ўмеў выкладаць. Калі застаўся сам-насам з вучнямі, то стала цяжэй. Да таго ж, група разрасталася, прыходзіла ўсё больш маленькіх дзяцей, сачыць за кожным было цяжка. Мяне хапіла на тры месяцы, пасля пачаліся рэпетыцыі да дзяржэкзаменаў — па тры на дзень. На ўсё ўжо не хапала сіл.

За права называцца харэографам студэнты мусілі здаць класічны і народны танцы, методыку выкладання. Арцёму лягчэй за ўсё даваўся менавіта народны танец. Любімыя рухі — прысядка і разножка. Але гэта не азначае, што сучаснымі танцамі ён не цікавіцца: можа паказаць майстэрства і на клубным танцполе.



— На дыскатэцы танцую не так, як на занятках, — прызнаецца харэограф. — У клубе я больш раскаваны, рухаюся ад душы, так як мне падабаецца. Можна сказаць, станаўлюся звычайным чалавекам і зліваюся з іншымі. Наўрад ці хтосьці скажа, што я выкладчык танцаў.

Пасля вучобы ў Арцёма была магчымасць застацца ў Гомелі — прапаноўвалі месца ў вясковай школе непадалёк ад горада. Аднак хлопец не пагадзіўся: давялося б здымаць жыллё. Затое ў Чачэрску яму адразу ж прадаставілі інтэрнат, хлопец стаў у чаргу на арэнднае жыллё. Да таго ж родная вёска — за 30 кіламетраў ад горада. Зараз маладому выкладчыку 20 гадоў, ён працуе харэографам у дзіцячай школе мастацтваў і выкладае хіп-хоп у Доме культуры. Самым маленькім навучэнцам — па 7 гадоў, у старэйшай групе займаюцца дзяўчаты і хлопчыкі па 10 гадоў. Цікава, ці ладзіць ён са сваімі вучнямі?

— Агульную мову з дзецьмі знайсці цяжка. Я добра гэта зразумеў яшчэ тады, калі пачаў выкладаць у Раманавічах, — прызнаецца сур азмоўца. — Да кожнага чалавека трэба індывідуальны падыход: аднаму трэба добрае слова, другому — большая нагрузка і строгасць. Я ж яшчэ шмат працую з дарослымі: даволі часта просяць паставіць танец на ўзнагароду альбо падтанцоўку. Дык, па маіх назіраннях, яны паводзяць сябе, як дзеці...



Фота Надзеі БУЖАН.

**У дзень магло быць каля шасці гадзін танцаў: народных, класічных, бальных, сучасных, гісторыка-бытавых. Арцём прызнаецца, што нават пасля такіх нагрузак заставаліся сілы хадзіць на... дыскатэкі.**

Сваю гадзіну трыумфу малады харэограф ужо перажыў: дзесяць дзяўчынак прадставілі на Новы год «Танец сняжынак». Бачыць штодня шчаслівыя твары дзяцей — найлепшая ўзнагарода для настаўніка. Пра сваіх вучаніц ён з гонарам кажа: «Яны вельмі здольныя, хутка ўлаўліваюць рухі, за занятак могуць развучыць цэлы танец». У выкладанні Арцём паўтарае методыку сваіх выкладчыкаў: таксама «ганяе» вучаніц за паставу. Тым больш, бацькі, аддаючы дзіця ў танцы, жадаюць атрымаць хаця б «мінімум»: каб спіна была роўная.

У дзіцячай школе мастацтваў ёсць людзі, якія працуюць тут не першы дзясятак гадоў. Ёсць у каго павучыцца, пераняць вопыт, што таксама каштоўна для маладога спецыяліста. Дарэчы, любімага танцора ў Арцёма няма, аднак яму падабаецца каманда Lord of the Dance, што танцуе ў стылі «чачотка». На думку чачэрскага харэографа, у іх добрая пастаноўка, якой варта павучыцца. І нарэшце выкладчык танцаў прызнаецца: яму самому больш падабаецца танцаваць, а не ставіць танцы.

Агулам на дзвюх працах штомесяц набягае заробак у тры мільёны, чаго хлопцу хапае нават з лішкам. Пасля размеркавання ён плануе паспрабаваць сябе ў іншай сферы: ёсць думка паступіць у... Мінскі авіяцыйны каледж на памочніка пілота. Прызнаецца, што самалёты яго вабілі заўжды. Але гэта зусім не значыць, што Арцём збіраецца паставіць крыж на танцах. Проста харэографу хочацца мець яшчэ адну прафесію, каб пасля выбіраць, чым яму займацца па жыцці.

**Кацярына РАДЗЮК.**
*Мінск — Чачэрск — Мінск.*

Імёны ў гісторыі

# ІХ БОЙ ВЫВУЧАЮЦЬ ПА ПАДРУЧНІКАХ

**Славутага савецкага танкіста Зіновія Калабанава сучасная моладзь ведае, хутчэй, дзякуючы айчыннай гульні World of Tanks — у танкавым сімулятары ёсць віртуальны медаль яго імя, які гульцу даюць за знішчэнне пяці і больш танкаў саперніка ў адным баі. Зіновій Рыгоравіч з ліку тых людзей, якія Героямі Савецкага Саюза так і не сталі. Увагу на праблему ўшанавання памяці танкіста напярэдадні Дня Перамогі вырашылі звярнуць удзельнікі міжнароднай спартыўнай ваенна-патрыятычнай эстафеты «Памяць», што праходзіла па маршруце Гатчына — Мінск. Карэспандэнт «Чырвонкі» паразмаўляў з яе кіраўніком і арганізатарам, падпалкоўнікам у адстаўцы, памочнікам рэктара Мінскай духоўнай акадэміі Сяргеем СОБАЛЕВЫМ.**

**У Германіі і іншых краінах той бой пад Гатчынай праходзяць ва ўсіх вайсковых бранятанкавых акадэміях, ён разглядаецца, як акадэмічны.**



**— Сяргей Васільевіч, раскажыце, як у вас узнікла ідэя правядзення эстафеты ў гонар Зіновія Калабанава?**

— Сёлетняя эстафета не першая, у 2013 годзе мы праводзілі аналагічнае мерапрыемства. Тады я прыйшоў да намесніка старшыні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі Сяргея Забалотца і прапанаваў яму правесці ў Мінску Кубак сяброўства па лыжаролерах з удзелам спартсменаў Беларусі, Расіі, краін Балтыі і далёкага замежжа. Ён у адказ параіў нам пасля правядзення Кубка пазнаёміцца з дакументамі па гісторыі подзвігу Калабанава. Тады і ўзнікла ідэя таго, каб правесці сумеснае з Расіяй спартыўнае мерапрыемства, якое б у чарговы раз нагадала грамадству пра гэтага чалавека. Тым больш, што навадніцаў у танку Калабанава ў славутым баі пад Гатчынай быў беларус Андрэй Усаў, які нарадзіўся на Талачыншчыне. Ён таксама не быў узнагароджаны «Залатой Зоркай», хоць і прадстаўляўся да яе.

У 2013 годзе мы і рэалізавалі задуму. Я сам у савецкія часы быў звышмарафонцам, у мяне шмат знаёмых, якія займаюцца гэтым відам спорту. Я з імі звязаўся, ініцыятыву яны падтрымалі, і два гады таму мы правялі першую эстафету разам з прадстаўнікамі з шасці гарадоў Расіі, у тым ліку з радзімы Калабанава — Ніжняга Ноўгарада, усяго 28 чалавек. Сёлета ўдзел у ёй узялі толькі беларусы, аматары бегу і веласпорту з Мінска, Брэста, Бабруйска, Жодзіна, Заслаўя. Усяго 11 чалавек: шэсць звышмарафонцаў, тры веласіпедысты і два бегуны. Дарэчы, сярод удзельнікаў было дзве жанчыны.

**— Якія мэты ставілі перад сабой удзельнікі сёлета?**

— Вядома, мы хацелі яшчэ раз нагадаць пра подзвіг роты Калабанава, пра тое, што гэтыя людзі, без перабольшвання, непасрэдна паўплывалі на ход вайны. Бо калі б фашысцкая танкавая армада тады ўзяла Гатчыну, ніякай блакады Ленінграда не было б — горад быў бы захоплены імгненна. Калабанаў не атрымаў «Залатую Зорку» Героя толькі таму, што за ім цягнўся шлейф адной гісторыі з часоў Фінскай вайны. Пасля аб'яўлення перамір'я камеры зафіксавалі размову Зіновія Рыгоравіча з фінскімі журналістамі, што было расцэнена як здрада Радзіме.

Пасля вайны пра яго подзвіг асабліва не прыгадвалі, ён быў звычайным рабочым на МАЗе. Ды і пахаваны быў без адпаведных вайсковых ушанаванняў. Іронія лёсу ў тым, што пра Калабанава нагадалі немцы. Падчас свайго візіту ў Мінск яны папрасілі паказаць яго магілу. Ледзь-ледзь яе адшукалі. У Германіі і іншых краінах той бой пад Гатчынай праходзяць ва ўсіх вайсковых бранятанкавых акадэміях, ён разглядаецца, як акадэмічны.




Але такі быў савецкі час... Мы хацелі распавесці гэтую гісторыю моладзі. Ну і, безумоўна, імкнуліся паказаць, што звышмарафонскі бег — гэта цікава. Насамрэч, зараз гэта не так папулярна. Магчыма, некага наша эстафета «зачапіла» і падштурхнула да заняткаў спортам.

**— Як праходзіла сама эстафета?**

— Усё пачалося ў Гатчыне, куды мы прыехалі на аўтобусе. Там наведалі месца славутага танкавага бою Калабанава, узялі з сабой зямлю, сустрэліся з мясцовымі жыхарамі. Дарэчы, зямлю нам дапамагаў браць удзельнік штурму Рэйхстага, гатчынец, палкоўнік у адстаўцы Мікалай Бяляеў. Адтуль жа і ўзялі старт. На маршруце веласіпедысты і бегуны падмянялі адно аднаго, калі зусім стамляліся. Але рытм быў неверагодным, упэўнены, што не кожны прафесійны спартсмен мог бы яго вытрымаць.

У большасці гарадоў нас сустракалі мітынгамі мясцовыя жыхары, прадстаўнікі гарадскіх адміністрацый. Выра, Луга, Пскоў, Апочка, Невель, Віцебск, Сянно, Талачын, Барысаў і Мінск — гэтыя гарады мы наведалі падчас эстафеты. Былі на месцах, звязаных з гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны, на брацкіх магілах, на месцах былых канцлагераў. Дзе-ніdroдзе нас на кароткай дыстанцыі праводзілі мясцовыя бегуны. Па ўсім шляху суправаджалі супрацоўнікі ДАІ. На мяжы Расіі і Беларусі адбылася ўрачыстая перадача эстафеты ад Дзяржаўтаінспекцыі Расіі іх беларускім калегам.

Але, пэўна, галоўнае мерапрыемства эстафеты адбылося ў Талачыне. Там мы адкрылі мемарыяльную дошку ў гонар маёра Андрэя Усава, пакінулі на яго магіле частку зямлі з месца бою пад Гатчынай. На беларускай частцы маршруту нам прыйшлося цяжка — быў моцны вецер, веласіпедыстаў літаральна выдзімала з дарогі, таму прыходзілася спыняцца. Але да гонару спартсменаў, яны здолелі працягнуць бег. Фінішавалі ў Мінску на плошчы Перамогі, дзе нас сустракала моладзь з усіх раёнаў сталіцы. Пасля заўпакойнай ліціі ва Усіхсвяцкім храме-помніку на вуліцы Каліноўскага была закладзена на вечнае захоўванне памятная капсула з той самай зямлёй з Гатчыны. Скончылася мерапрыемства на Чыжоўскіх могілках, дзе мы наведалі магілу Калабанава.

**— Ці задаволены вы вынікамі мерапрыемства?**

— Так, але канчатковая наша мэта — прысваенне Калабанаву і Усаву звання Героя Расіі і Героя Беларусі адпаведна. У Расіі ініцыятыўная група чарговы раз збірае подпісы для таго, каб гэта ажыццявіць, магчыма, і ў нас атрымаецца такім чынам ушанаваць памяць герояў вайны.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**



**Зіновій Рыгоравіч КАЛАБАНАЎ — савецкі танкіст-ас, камандзір роты цяжкіх танкаў. Найбольш вядомым боем з яго ўдзелам з'яўляецца бой пад Гатчынай (тады — Красногвардзейск) у жніўні 1941 года. Дзякуючы дэталёва выверанай стратэгіі і размяшчэнню засады пяць танкаў пад камандаваннем Калабанава знішчылі 43 танкі праціўніка. Пасля вайны жыў у Мінску, працаваў на Мінскім аўтамабільным заводзе. Памёр у 1994 годзе.**



**Андрэй Міхайлавіч УСАЎ — камандзір гарматы ў складзе экіпажа танка КВ-1 пад камандаваннем Калабанава. У баі пад Гатчынай снайперскім агнём знішчыў 22 танкі праціўніка. Пасля вайны жыў на малой радзіме ў Талачыне, займаўся партыйнай і гаспадарчай працай. Памёр у 1986 годзе.**

# «МЫ ЖЫЛІ АДНОЙ МАРАЙ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

Рыгор Прышчэпны ўзгадвае, што ў разведроце ў асноўным служылі яго равеснікі. Ён мяркуе, што перавагу самым маладым аддавалі таму, што ім не было пра што шкадаваць: ні жонак, ні дзяцей... У самога ж Рыгора Васільевіча за ўвесь час службы ні разу не з'явілася думка, што ён можа загінуць. Жартам кажа, што на заданні ішоў, як на працу.

— Нягледзячы на тое, што смерці мы не баяліся, яна заўсёды была побач, — узгадвае ветэран. — Са мной яна сустрэлася ўжо напрыканцы вайны, на нямецкай тэрыторыі. Мясцовае насельніцтва часта ставілася да чырвонаармейцаў негатыўна ці нават з непрыхаванай агрэсіяй. Аднойчы мы з напарнікам зайшлі ў двухпавярховы будынак, непадалёк ішоў бой. Спыталі ў гаспадыні, старой жанчыны, ці ёсць у доме нямецкія салдаты. Яна пакачала галавой — не. Вырашылі праверыць. У адным з пакояў стаяла шафа. Раптам, калі мы былі побач, яе дзверы адчыніліся і адтуль мне выстралілі ў твар, ажно асляпіла. Я аўтаматычна ў тую ж секунду даў чаргу па шафе са свайго ППС. Немец нейкім неверагодным чынам прамахнуўся — куля прастрэліла толькі капюшон на маім маскхалаце.

Падзеі вайны Рыгор Васільевіч узгадвае без асаблівага імпэту. Ён прызнаецца, што яны дагэтуль трывожаць яго душу. Ужо ў пасляваенны час у адпачынку на Радзіме ён часта хадзіў на паляванне. Браў стрэльбу, патроны, ішоў у лес,назіраў за дзічынай, але ніколі не страляў па жывых істотах... Для яго за шчасце было адчуваць прыроду, не кранаючы гэтай прыгажосці.

Перамогу Рыгор Прышчэпны сустрэў 7 мая ва Усходняй Германіі. Шчаслівую навіну паведаміў радыст. Святкаванне было, па вайсковых мерках таго часу, багатым: тушонка, галеты, хлеб і спірт-сырэц, якога выдавалі па сто грамаў кожны дзень. Ветэран памятае, што ад радасці і ўзбуджэння ўпершыню за ўвесь час вайны прыклаўся да флягі са спіртам. Ды так, што пасля праспаў усю ноч каля клумбы на вуліцы.

— З тых часоў у мяне з'явілася агіда да алкаголю, — прызнаецца суразмоўца. — Мог зрэдку выпіць трохі віна. Але ўжо 20 гадоў, як я ўвогуле не п'ю спіртнога. Дарэчы, многія на фронце грашылі ўжываннем алкаголю, і гэта можна зразумець. Але часта аматары выпіўкі расплачваліся за тое жыццём. Разведчыку заўсёды трэба быць напагатове, а алкаголь абуджае самыя страшныя, цёмныя інстынкты: агрэсію, нянавісць. І ў моманты, калі сітуацыя патрабавала хуткага і ўзважанага прыняцця рашэнняў, галава падводзіла хлопцаў.

Вярнуўся з фронту Рыгор Васільевіч на... веласіпедзе. Два тыдні разведрота правяла, круцячы педалі. Бацька Рыгора Прышчэпнага загінуў падчас вызвалення Днепрапятроўска. Маці параіла хлопцу самому шукаць сабе месца ў жыцці, не вяртаючыся на малую радзіму. Ён прыехаў у Мінск і працягнуў службу ў арміі, адначасова вучыўся ў вайсковым вучылішчы, пасля паступіў на геаграфічны факультэт БДУ. Служыў пад Масквой. У 1975 годзе скончыў службу і прыехаў працаваць у Мінскі радыётэхнічны інстытут на кафедру вышэйшай матэматыкі, тут ён і цяпер. Ветэран часта выступае перад студэнтамі, дзеліцца з імі сваімі думкамі і ўспамінамі.

— Мне цяжка параўноўваць маё пакаленне і сённяшнюю моладзь, — разважае Рыгор Васільевіч. — Я не магу сказаць, што мы былі лепшыя ці горшыя. Мы проста розныя. Наша пакаленне, як мне падаецца, было больш сціплым, паслухмяным, з большай павагай ставілася да старэйшых. Сённяшняя моладзь значна больш пісьменная, адукаваная, у тым ліку і дзякуючы інтэрнэту. Яна цікавіцца ўсім на свеце, не сарамеецца задаваць пытанні. Студэнты хутка знаходзяць адказы, цягнуцца да ведаў. Гэтыя веды выхоўваюць у іх самастойнасць, крытычнае мысленне. Але адна з сур'ёзных праблем, якую я заўважаю, — гэта лянота. Далёка не ўсе паспяхова з ёй змагаюцца. Акрамя таго, сучасныя студэнты ў большай ступені індывідуалісты, чым калектывісты, што таксама ўплывае на іх характары. Я цешуся надзеяй, што яны сапраўдныя патрыёты. Бо калі раптам здарыцца такое, як было 70 з лішкам гадоў таму, беларусы будуць патрэбны абаронцы, гатовыя аддаць усё для яе будучыні.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

## Пісьмо дзеду

*Зайздросціць буду тым, хто бачыў*
*дзядоў і прадзедаў сваіх.*
*Я ж толькі карткі пазначу —*
*жывых я не сустрэла іх.*

*Мне попел у спадчыну застаўся*
*мінулых, невядомых бед,*
*ды сціплы гонар захаваўся*
*і страты пачуццё ўслед.*

*Віншую тых, хто ў пекле выжыў,*
*хто вытрымаў апошні бой!*

*Сваім сумленнем не пакрыўджу*
*загартаваных той вайной.*

*Ты не судзі нас, дзеда, строга —*
*мы помнім ратны подзвіг твой.*
*І знойку — як заўжды вясной —*
*нас акрыляе Перамога!*

**Альбіна ПЯТРОВА,**
**вучаніца 9 класа**
**гімназіі №1**
**г. Рэчыца.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
07 05 2015 г.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703.** |
| **Продавец** | **ОАО «Витебский хладокомбинат», г. Витебск, ул. Полярная, 8.** |

**Предмет аукциона**

**Здание административно-хозяйственное**, инвентарный номер 200/С-46403, общей площадью **645,2** кв.м, расположенное по адресу: **Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43.**
Составные части и принадлежности: пристройка, пристройка, ступеньки, крыльцо, проезжая часть (покрытие – асфальтобетон, участок 1 пл. – 1525,7 кв.м, участок 2 пл. – 236,9 кв.м), пешеходная часть (116,7 кв.м, покрытие – асфальтобетон) ограждение (уч. 1, 2, 3, 4, 5), ворота). Обременения: частичная аренда.

**Гараж-склад,** инвентарный номер 200/С-51544, общей площадью 66 кв.м, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43/ 1.

**Водомерный узел**, инвентарный номер 200/С-51546, общей площадью 12 кв.м, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, д. 43А/11.
Составные части и принадлежности: проезжая часть (участок 1 – покрытие-асфальтобетон, пл. 64,4 кв.м; участок 2 – покрытие-асфальтобетон, пл. 245,4 кв.м), ограждение, ворота).

**Водопроводная сеть**, инвентарный номер 200/С-87067 (протяженность – 107,1 м, способ прокладки – подземный траншейный).

**Хозбытовая канализационная сеть**, инвентарный номер 200/С-87069 (протяженность – 55,7 кв.м, способ прокладки – подземный траншейный).

**Сведения о земельных участках:** для содержания и обслуживания административно-производственных зданий и сооружений, продавцу на праве постоянного пользования предоставлены два земельных участка:

Кадастровый номер: 240100000003001750. Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, д. 43. Площадь (га): 0.4515. Данный земельный участок является неделимым. По участку проходит часть тепловой сети, не входящей в состав имущества, подлежащего продаже. При реализации недвижимого имущества земельный участок будет предоставлен в общую долевую аренду.

Кадастровый номер: 240100000003007468. Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43А/11. Площадь (га): 0.0417.

**Начальная цена с НДС 20% – 2 997 000 000 бел. руб. (снижена на 50%).**

Предмет аукциона обременен договорами аренды.

**Задаток 10% от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **15** (пятнадцати) рабочих дней после проведения аукциона.

**Условия оплаты:** если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение **30** (тридцати) календарных дней после проведения аукциона.

**Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 02.04.2015**

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и возмещения суммы фактических затрат за организацию и проведение аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **21.05.2015** в 14.00 по адресу: г. Витебск, ул. Полярная, 8 ОАО «Витебский хладокомбинат».

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.05.2015** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

## Извещение о проведении аукционных торгов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

| Предмет аукциона | Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) на земельном участке | | |
|---|---|---|---|
| | лот №1 | лот №2 | лот №3 |
| | по ул. Карла Маркса, 90, 92 и 94, на земельном участке площадью 0,1671 га | на пересечении ул. Менжинского, 3 и ул. Салтыкова Щедрина, на земельном участке площадью 0,4703 га | по ул. Свято-Афанасьевской в г. Бресте на земельном участке площадью 0,1000 га |
| **Функциональное назначение земельного участка** | строительство объекта общественного питания и торговли | строительство объекта торгово-административного назначения | строительство блокированного жилого дома |
| **Вещное право предоставляемого земельного участка** | **в аренду сроком 5 лет** | **в аренду сроком 5 лет** | **в собственность негосударственного юридического лица Республики Беларусь** |
| **Объекты недвижимости, подлежащие сносу** | жилые дома граждан по ул. Карла Маркса, 92 и 94 | жилой дом граждан по ул. Менжинского, 3 | здание и сооружения отдела культуры Брестского горисполкома |
| **Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объекты расположены в районах с развитой инженерной инфраструктурой** | | | |
| **Начальная цена продажи (руб.)** | **359 271 453** | **910 771 730** | **143 904 600** |
| **Сумма задатка (руб.)** | 71 850 000 | 182 150 000 | 28 780 000 |
| **Расходы по подготовке градопаспорта, земельно-кадастровой документации, тех.условий, АПЗ (руб.)** | 24 018 128 | 10 943 936 | 17 079 399 |
| **Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям, (руб.)** | **1 492 139 000** *(на 27.05.2014 г.)* Сумма фактического размера убытков будет рассчитываться на этапе отвода земельного участка, при этом дом по ул. Карла Маркса, 90 после отселения будет переведен в состав нежилого фонда и оценен по рыночной стоимости | **512 550 000** *(на 28.06.2014 г.)* | **88 085 701** *(на 05.03.2015 г.)* |

**По лотам №1 и № 2 – повторные аукционные торги.**
**Дополнительные условия продажи для победителя аукциона: по лоту №1 –** при изъятии земельного участка по ул. Карла Маркса, 92 в г. Бресте возмещение убытков землепользователю в виде предоставления в собственность квартиры типовых потребительских качеств из расчета не менее 15 кв. метров на собственника и на каждого члена его семьи, зарегистрированного по месту жительства и осуществление в течение 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах торгов компенсации расходов КУП «Брестское ДЭП» по ликвидации последствий чрезвычайной ситуации (пожара) в размере 52 022 090 рублей; **по лотам №№1-3** содержание приобретенной территории в надлежащем техническом и санитарном состоянии (самостоятельно или путем заключения договора со специализированной организацией г. Бреста)

**ОРГАНИЗАТОР ТОРГОВ – КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»**

**Условия продажи:**
Земельный участок будет предоставляться победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление ему предмета аукциона (по лотам №1 и №2 в аренду сроком на 5 лет, а по лоту 3 в собственность негосударственного юридического лица Республики Беларусь) для строительства и обслуживания объекта, на основании решения Брестского горисполкома об изъятии и предоставлении земельного участка, при соблюдении следующих условий:

- в день проведения аукциона будет подписан акт выбора места размещения земельного участка;

- в установленном порядке будет заключен с проектной организацией договор на разработку проектной документации на строительство объекта (с выделением при необходимости отдельных этапов) с учетом ее государственной экспертизы в срок, не превышающий двух лет, со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка;

- в срок, не превышающий одного года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка, будет предоставлен в ДУП «Проектный институт Брестгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утверждаемой части строительного проекта, с учетом прохождения в установленном порядке согласования в управлении архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома, и заключен договор подряда на разработку проекта отвода земельного участка под объект строительства;

- в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка на р/с городского бюджета будут внесены суммы платежей, отраженных в протоколе о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размерах, определенных соответствующим протоколом аукционных торгов в счет оплаты за предмет аукциона (победителем аукциона – в размере цены продажи, сформированной по результатам аукциона, а единственным участником – в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов) и компенсации расходов, понесенных городским бюджетом, по подготовке градостроительного паспорта, земельно-кадастровой документации, архитектурно-планировочного задания и технических условий на размещение объекта;

- до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, подписания договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), а также договора аренды земельного участка будут выполнены условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан приступить к освоению (занятию) земельного участка в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство объекта).

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462, и состоится при наличии не менее двух участников.** В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом** – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык**; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель)** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924.**

В случае признания участника победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона, выразившим согласие на предоставление ему предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, данное лицо обязано в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов **возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.**

**Аукцион состоится 11 июня 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 07.05.2015 г. до 17.30 05.06.2015 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www.gki.gov.by**

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Бресте

| № лота | Адрес участка/ кадастровый номер | Кадастровый номер 14010000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Срок аренды, лет | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расх. по подг. земел.- кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | в районе ул. Гродненской | 1029050 | 0,5113 | строительство и обслуживание торгового центра | 10 | **626 127 114** | 125 225 000 | **36 124 330** | 0,0626 га – охранная зона сетей и сооружений канализации<br>0,1436 га – охранная зона сетей и сооружений водопровода |
| 2 | ул. Писателя Смирнова | 1029049 | 0,4000 | строительство и обслуживание торгового центра | 10 | **278 709 329** | 55 740 000 | **40 524 056** | 0,0108 га – охранная зона подземной линии связи и радиофикации<br>0,0030 га – охранная зона сетей и сооружений канализации |
| 3 | в районе ул. 5-й Кедровой | 1029052 | 0,2363 | строительство и обслуживание магазина со смешенной группой товаров, с мини-кафе | 10 | **134 702 201** | 26 940 000 | **36 071 958** | 0,0367 га – охранная зона линии электропередач напр. до 1000 В<br>0,0509 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения<br>0,0972 га – охранная зона сетей и сооружений канализации<br>0,0353 га – охранная зона мелиоративных земель |
| 4 | на перекрестке ул. Коммерческой и ул. Автолюбителей | 1029051 | 0,4899 | строительство и обслуживание объекта торговли | 10 | **527 455 125** | 105 490 000 | **45 123 737** | 0,1163 га – охранная зона сетей и сооружений канализации |
| 5 | в районе ул. Луцкой | 1029053 | 0,9615 | строительство и обслуживание объекта производственно-складского назначения | 10 | **730 098 074** | 146 010 000 | **36 273 033** | 0,0166 га – охранная зона подзем. линии электропередачи напр. до 1000 В<br>0,0339 га – охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения |
| 6 | ул. Богданчука | 1029054 | 0,4210 | строительство 40-квартирного жилого дома согласно проекту уплотнения квартала жилой застройки в районе политехнического университета | 10 | **403 867 259** | 80 770 000 | **27 414 114** | 0,4210 га – водоохранная зона реки Мухавец<br>0,0105 га – охранная зона линии электропередачи<br>0,0950 га – охранная зона сетей и сооружений канализации<br>0,0140 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения |
| 7 | в районе путепровода по ул. Пионерской и ул. Мошенского | 1029055 | 0,6954 | строительство центра автомобильных услуг | 10 | **318 348 496** | 63 660 000 | **33 366 909** | 0,0330 га – охранная зона линии электропередачи напр. до 0,4 кВ |
| 8* | ул. Карьерная | 1028438 | 0,2800 | строительство и обслуживание объекта производственно-офисного, бытового назначения | 10 | **180 292 997** | 36 050 000 | **8 447 772** | ограничений в использовании земель нет |
| 9* | в районе ул. Ковельской, 85 | 1027194 | 0,0096 | строительство и обслуживание магазина продовольственной группы товаров | 10 | **10 604 090** | 2 120 000 | **450 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 10* | №68 (по ГП) согласно ПДП «ЮЗМР-3» | 1025057 | 0,5793 | строительство и обслуживание бизнес-центра, гостиничного комплекса | 10 | **848 817 784** | 169 760 000 | **450 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 11* | ул. Писателя Смирнова | 1028423 | 1,0909 | строительство и обслуживание торгового объекта | 10 | **811 561 986** | 162 300 000 | **15 206 021** | 0,0597 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения |
| 12* | ул. 2-я Белорусская | 1019335 | 0,8704 | строительство и обслуживание объекта производственного назначения | 10 | **612 342 485** | 122 460 000 | **1 450 817** | 0,1041 га – охранная зона канализационного коллектора;<br>0,0208 га – охранная зона газопровода среднего давления |
| 13* | в районе ул. Волгоградская | 1025064 | 0,2967 | строительство и обслуживание спортивных сооружений | 10 | **421 357 318** | 84 270 000 | **1 306 845** | ограничений в использовании земель нет |
| 14* | ул. Высоковская | 1027693 | 0,4733 | строительство и обслуживание объекта питания с общественно-бытовыми помещениями | 10 | **842 852 952** | 168 570 000 | **5 941 339** | ограничений в использовании земель нет |
| 15* | ул. М.Л. Мошенского | 1025787 | 0,9446 | строительство и обслуживание автостоянки | 10 | **1 192 434 079** | 238 480 000 | **1 513 733** | 0,0060 га – охранная зона газопровода среднего давления |
| 16* | ул. Базановой, 4 | 1026802 | 0,0187 | установка и обслуживание объекта торговли | 10 | **51 003 514** | 10 200 000 | **1 407 198** | 0,0032 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением до 1000В; 0,0056 га – охранная зона водопровода |
| 17* | ул. Красногвардейская | 1026816 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения №1 | 10 | **3 708 220** | 740 000 | **1 529 617** | 0,0002 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000В |
| 18* | ул. Красногвардейская | 1026817 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения №2 | 10 | **3 708 220** | 740 000 | **1 001 905** | 0,0021 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000В |
| 19* | ул. Красногвардейская | 1026818 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения №3 | 10 | **3 708 220** | 740 000 | **1 001 905** | ограничений в использовании земель нет |

**Дополнительное условие для победителя аукциона:** содержание приобретенной территории в надлежащем техническом и санитарном состоянии (самостоятельно или путем заключения договора со специализированной организацией г. Бреста)

***повторные аукционные торги**

**ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ – КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462, и состоится при наличии не менее двух участников.**

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924**.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере определенном соответствующим протоколом аукционных торгов осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. №881.

• в течение 2 рабочих дней после перечисления платежей заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка;

• в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией договора аренды участка, а также прав на него;

• приступить к занятию земельного участка (начать строительство, иное освоение земельного участка) в течение 6 месяцев (для юридического лица, индивидуального предпринимателя) и в течение 1 года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения).

**Аукцион состоится 11 июня 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 07.05.2015 г. до 17.30 05.06.2015 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**
**Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www.gki.gov.by**

07 05 2015 г.

**Я маладый! І мне не ўсё роўна!..**

**Юнкары, увага!**

**Наш творчы конкурс для юных і маладых няштатных аўтараў «Я — маладый. І мне не ўсё роўна!» сконччыў прыём «проб пяра». Але гэта не азначае, што ён пакідае старонкі «Чырвонкі. Чырвонай змены». Нямала работ ад ахвотных прыняць удзел у «журналісцкім спаборніцтве» прыйшлі на наш адрас літаральна ў апошнія дні. Лепшыя з іх будуць апублікаваны ў найбліжэйшых нумарах, так што сачыце за газетай. Нагадваем, што, як і было абяцана, вынікі нашага творчага конкурсу будуць падведзены і абвешчаны да пачатку ўступнай кампаніі. Упэўнены, што прайграўшых не будзе, нават калі нехта і не ўбачыць сваю працу надрукаванай. Паверце, любы досвед каштоўны! А пакуль мы рэдагуем апошнія з дасланых «проб пяра», раім не сядзець склаўшы рукі. Пішыце ў «Чырвонку. Чырвоную змену» пра тое, што вас цікавіць і хвалюе. Чакаем вашых допісаў!**

# ЗНАЙДЗІ СЯБЕ САМ — У СПРАВАХ!

**Я гатова паспрачацца з тымі, хто сцвярджае, што маленькія гарады ці вёскі не даюць магчымасці знайсці сябе маладым людзям. Я — з іх ліку.**

У гарадку дзве школы і гімназія. Ёсць музей краязнаўства, дом рамёстваў, тры бібліятэкі, школа мастацтваў, дзе займаюцца юныя мастакі і музыканты. Клуб юных маракоў, фізкультурна-аздараўленчы комплекс. Спартыўныя секцыі, харавыя гурткі, якіх безліч у Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі, Доме культуры. Гэта накont таго, як з карысцю і цікава можна правесці час. Самім. Хто хоча, той знойдзе, хто стукае, таму адчыняюць. Жыць па інерцыі — не той шлях, які мае перспектыву. Згодны са мной? Для мяне важна, каб кожны дзень, тыдзень, месяц былі запоўнены. Каб не было сумна, бязглуздна, абыякава, каб не шукаць прыгод на сваю галаву. Зразумела, у якім сэнсе. Што змяніць у паўсядзённасці, куды можна скіраваць нераўнадушны позірк?

15 гадоў існуе гурток «Юны журналіст і дыктар» пры Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі. Я ў ім чатыры гады. Для гараджан і жыхароў раёна гуртоўцы рыхтуюць святочныя радыё-праграммы да кожнага свята. Таксама былі публікацыі пра найлепшыя падвор'і. Юныя журналісты-краязнаўцы і эколагі ў адной асобе сфатаграфавалі і паказалі землякам магчымасці стварэць цуды на ўласнай зямлі: куточкі, якія радуюць сэрца і вабяць вока.

Не магу забыцца пра сустрэчы з ветэранамі вайны і працы. Ужо колькі гадоў наведваем трох франтавікоў, на жаль, адзін з іх пайшоў з жыцця. Цешым сябе, што пра ўсіх напісалі і не аднойчы. Не парываецца наша сяброўства з першай настаўніцай школы, дзе вучымся. Побач з навучальнай установай жыве жанчына-інвалід, мы часта наведваем яе. Ужо больш за 10 гадоў супрацоўнічаем з раённай арганізацыяй Чырвонага Крыжа. Валанцёрства — неабсяжная колькасць спраў: экалогія, шэфства, дзякуючы якому мы набылі дзясяткі сяброў, гасцявалі і прымалі гасцей, удзельнічалі ў праектах і акцыях. Я ганаруся тым, што гараджане ведаюць у твар валанцёраў. Здаецца, ніхто не адмовіў у дапамозе нам.

У дзіцячым садку №7 мы зрабілі кармушкі і зладзілі мерапрыемства, прысвечанае здароваму ладу жыцця. У дзіцячай бібліятэцы правялі выставу «Маё хобі». Кожны з нас прэзентаваў сваё, адметнае. Дзеці прыходзілі нават з бацькамі. Ёсць сувязі з лясгасам. Ды ці толькі з ім? Мы наведалі ўсе арганізацыі горада, хадзілі на экскурсіі паўсюдна, куды можна. Вы яшчэ не ўпэўніліся, што ўсё ў нашых з вамі руках?

**Пра аўтара**

**— Мне вельмі падабаецца музыка. Я скончыла музычную школу па класе фартэпіяна, а цяпер вучуся іграць на гітары. Яшчэ наведваю хор і мноства гурткоў, выступаю на школьных і раённых конкурсах і вечарах, спрабую сябе ў якасці вядучай і журналіста. Не раз займала прызавыя месцы на конкурсах чытальнікаў: у «Зубраняці», у школе, на раённых і абласных конкурсах, — распавяла пра сябе Дар'я.**

**Яшчэ 16-гадовая дзяўчына спявае на сцэне раённага Дома культуры, удзельнічае ў тэатральных пастаноўках. Не прапускае школьныя алімпіяды і рознага кшталту інтэлектуальныя гульні. Яе хобі — вывучэнне англійскай мовы.**

**— Але галоўная мая мара — стаць журналістам, — кажа Дар'я. — Ведаю, што гэта будзе нялёгка, але я не здамся.**

Разумеючы, што час не спыніць, знайдзі і захавай памяць пра ўласны род, бо з яго складаецца народ. Некалькі слоў пра тое, што, на маю з сябрам думку, трэба ствараць. Ствараць умовы для падарожжаў у самыя разнастайныя куткі Беларусі. Бо часам замежжа ведаюць лепш за ўласную краіну. Гэта трэба. Ганаруся, што наш «Покліч Палесся» — міжнародны фестываль этнакультуры — ведаюць шмат дзе. Але хачу пабываць на Брэстчыне, Гродзеншчыне, Магілёўшчыне. Пабачыць, параўнаць, пераняць. А яшчэ ёсць ідэя. Хочацца, каб Беларусь стала чытаючай краінай. Але ў нас мала рэкламы пра карысць чытання. Няма рэкламных шчытоў, бігбордаў, нават у сталіцы. У метро ўбачыш любую рэкламу, але не гэтую, а выдатна, калі б была такая — «Чытаючы чалавек». Яшчэ мы прапанавалі назваць вуліцу мікрараёна імем Віці Сітніцы, удзельніка партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, піянера-героя, які нарадзіўся ў нашым раёне. Адміністрацыя горада дала «дабро».

**Дар'я НЕСЦЯРЧУК,**
**вучаніца 10 класа СШ №1**
**г. Петрыкава.**

# ТАМ, ДЗЕ ЖЫВЕ ПАМЯЦЬ...

**Сярод усіх мерапрыемстваў, прысвечаных вайне і Перамозе, якія арганізуюцца Баранавіцкім раённым камітэтам БРСМ, самым адметным я лічу акцыю «Гэты боль назаўжды», што стала ўжо традыцыяй. На працягу пяці гадоў 21 і 22 чэрвеня яна праводзіцца ў вёсцы Калдычэва.**

Гэты населены пункт абароны нездарма абраны. У час вайны маляўнічыя мясціны пазтаў Адама Міцкевіча і Яна Чачота набылі сумную славу. З 1942 па 1944 год у вёсцы знаходзіўся канцэнтрацыйны лагер смерці. Умовы ў ім былі нечалавечымі. Вязняў марылі голадам, непасільнай працай, кожны дзень білі да паўсмерці, вешалі і расстрэльвалі. З мэтай павышэння смяротнасці фашысты свядома садзейнічалі распаўсюджванню тыфу і дызентэрыі. У пекле Калдычэва развіталіся з жыццём 22 тысячы савецкіх патрыётаў. Сёння пра трагедыю нагадваюць рэшткі турмы, дуб, на якім вешалі вязняў, і брацкая магіла з помнікам маці ў жалобе. Таму менавіта ў гэтых мясцінах 22 чэрвеня пачынаецца ўшанаванне памяці ўсіх ахвяр Вялікай Айчыннай вайны.

...Напярэдадні ўвечары ўдзельнікі акцыі каля сцен лагера разбіваюць палатачны гарадок, вараць салдацкую кашу, спяваюць песні пад гітару. На экране, створаным на паляне, усю ноч глядзяць кадры ваеннай хронікі і сучасныя фільмы пра вайну. Роўна ў чатыры гадзіны раніцы ўдзельнікі акцыі запальваюць свечкі каля брацкай магілы і помніка. А днём 22 чэрвеня ў Калдычэва прыязджаюць ветэраны, кіраўнікі раённай адміністрацыі і проста неабыякавыя людзі, каб хвілінай маўчання ўшанаваць памяць загінулых. Нікога не пакідае раўнадушным экскурсія па мемарыяльным комплексе. Гісторыі лёсаў, перакрэсленых вайной, нечалавечай жорсткасці і вялізнай мужнасці людзей уражваюць яшчэ больш, калі гучаць у месцах, дзе і сёння чуецца подых смерці: каля сцен канцэнтрацыйнага лагера, брацкай магілы і палітага крывёю і слязамі дуба.

Неад'емнай часткай акцыі «Гэты боль назаўжды» з'яўляецца выстава дзіцячых малюнкаў ваеннай тэматыкі, прадстаўленая на сцэнах лагера смерці. Дзіцячыя малюнкі — сімвал жыцця, сімвал еднасці людзей часоў ваеннага ліхалецця і мірнага часу.

Акрамя актывістаў БРСМ, у акцыі пастаянна прымаюць удзел і выхаванцы Брэсцкага абласнога кадэцкага вучылішча. Гэтыя маладыя людзі хутка стануць абаронцамі Айчыны і таму неабходна зрабіць усё, каб яны былі годнымі прадаўжальнікамі традыцый дзядоў-пераможцаў.

...У Калдычэве нават днём цяжка знаходзіцца: атмасфера смерці і нейкая ненатуральная цішыня адчуваюцца ледзь не фізічна. І гэта зразумела. Сцены лагера памятаюць плач і стогны вязняў, дуб-шыбеніца палохае, а таму спакойна стаяць каля магілы, дзе пахавана 22 тысячы чалавек, немагчыма. Дарэчы, на яе месцы раней быў дом каменданта лагера, дзе ў падвальных катоўнях дзень і ноч памiралі людзі. Пасля адной ночы, праведзенай у страшных мясцінах, пачынаеш на пэўныя рэчы глядзець абсалютна па-новаму, многае пераацэньваеш.

На камені-помніку ахвярам Калдычэўскага лагера смерці напісаны словы: «Калі скажуць, што попел маўчыць — не верце. Не верце, што ў вас пад нагамі маўклівы жвір... Чуеце? Мы вам завяшчаем жыццём і смерцю: Цаніце мір! Беражыце мір!» Той, хто хоць раз прыняў удзел у акцыі «Гэты боль назаўжды», ужо ніколі не пры якіх абставінах не зможа пераступіць праз гэты запавет.

**Пра аўтара**

**Валерыя — удзельніца алімпіяды па беларускай мове і літаратуры: на «рэспубліцы» летась атрымала дыплом ІІІ ступені, сёлета стала пераможцам абласнога этапу. 16-гадовая дзяўчына некалькі гадоў займалася навукова-даследчай працай на тэму «Мясціны Баранавіччыны ў творчасці пісьменнікаў-землякоў», з якой на рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі ў гэтым годзе атрымала дыплом ІІІ ступені. Валерыя актыўна вывучае англійскую мову і гісторыю Беларусі, цікавіцца падзеямі Вялікай Айчыннай вайны.**

**— Абрала для сябе прафесію журналіста, пасля заканчэння школы мяркую паступаць у Інстытут журналістыкі БДУ. Актыўна друкуюся ў раённых, абласных і рэспубліканскіх газетах, — распавядае Валерыя. — Як будучы журналіст, упэўнена ў сіле друкаванага слова, таму ў прафесійнай дзейнасці плануую зрабіць усё магчымае для адраджэння беларускай мовы.**

**Валерыя СЦЯЦКО,**
**вучаніца 11 класа**
**Мірскай сярэдняй школы**
**Баранавіцкага раёна.**

# ЯКІЯ МЫ СЁННЯ, ТАКІМ БУДЗЕ І ЗАЎТРА

**У кожнага з нас сваё стаўленне да той ці іншай праблемы, якіх у нашым грамадстве шмат. Я ўпэўнена, што моладзь у першую чаргу хвалююць такія пытанні, як чысціня мовы, барацьба з дрэннымі звычкамі і адносіны да старэйшага пакалення.**

Пачну з таго, што з праблемай брыдкаслоўя мы ўсе сутракаемся ў паўсядзённым жыцці. У нашым ліцэі змагаюцца з ёй такім чынам: мы пішам конкурсныя сачыненні па тэму «Свет без брыдкаслоўя — твой рэцэпт», праводзім практычныя семінары, дзе абмяркоўваем прычыны гэтай з'явы і шляхі яе выкаранення, праводзім розныя акцыі, напрыклад, «Мы — за чыстую мову». Гэта адна з невялічкіх праблем, аднак маленькія праблемы аднойчы перарастаюць у вялікія. Яшчэ Арыстоцель пісаў: «Заканадаўца павінен выдаляць з дзяржавы брыдкаслоўе, таму што са звычкі брыдкасловіць развіваецца і схільнасць да здзяйснення дрэнных учынкаў». Напрыклад, такіх, як курэнне. Гэта вельмі сур'ёзная праблема, і не толькі медыцынская, але і сацыяльная. У той час, як у Еўропе і ў Амерыцы ўсё больш і больш распаўсюджваецца схільнасць да здаровага ладу жыцця, у нас усё зусім наадварот. На курэнне ў нашым ліцэі звяртаюць асаблівую ўвагу. Аднойчы праходзіла акцыя «Памяняй цыгарэту на цукерку», якую зладзілі навучэнцы і ўдзельнікі БРСМ. Яе ўмовай было зламаць цыгарэту і выкінуць яе ў скрыню: за гэта навучэнец атрымліваў смачную цукерку.Тады нашы актывісты раздалі амаль пяць кілаграмаў цукерак! Настаўнікі вырашылі ўвогуле пазбавіцца ад гэтай дрэннай звычкі ў ліцэі і ўсіх курцоў паклікалі на «пахаванне» цыгарэт.

Мяне, як і ўсю моладзь, хвалюе гісторыя нашай краіны. Летась адбылася важная падзея: Беларусь святкавала 70 гадоў свайго вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І нашы навучэнцы прынялі ўдзел у акцыі «Дзякуй салдатам Перамогі за тое, што не ведаем вайны». У вёсцы Новая Мыш адбыўся ўрачысты мітынг «Рэквіем салдатам Перамогі», прысвечаны Дню Перамогі. Ладзілася таксама культурна-спартыўнае мерапрыемства, прысвечанае 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Найлепшым вучням уручылі квіткі на чэмпіянат свету па хакею: Уладзіміру Пурпулеўскаму, Глебу Весялоўскаму, Анатолю Корабу. Свята працягвалася ў актавай зале ліцэя, дзе прайшло тэатралізаванае прадстаўленне «Песні нашых бацькоў», на якое былі запрошаны падшэфныя інваліды і ветэраны. Ініцыятарам, арганізатарам і ідэйным натхняльнікам гэтага мерапрыемства стаў рэжысёр народнага тэатра «На Мышанцы» Станіслаў Станіслававіч Пшэўлоцкі, чалавек таленавіты і творчы. Дзякуючы яму ў выкананні вучняў і педагогаў загучалі песні пра вайну — як добра знаёмыя мелодыі, так і новыя. Мы не забываемся дапамагаць нашым героям, якія ў цяжкія часы адстаялі сённяшнюю квітнеючую Беларусь. Валанцёры Навамышскага ліцэя аказваюць шэфскую дапамогу ветэрану Вялікай Айчыннай вайны Мікалаю Цімафеевічу Зайкоўскаму. Мы любім і паважаем старэйшае пакаленне.

**Мы павінны быць камунікабельнымі. З намі будзе лёгка мець зносіны. Мы цікавыя, эрудзіраваныя. Верым, што дзяржаўныя межы будуць існаваць толькі на карце, а не ў нашай свядомасці і зносінах. Такой павінна быць моладзь сёння, такой павінна быць моладзь будучыні!**

Я лічу, мы павінны быць актыўнымі грамадзянамі, адказнымі перад грамадствам, сям'ёй, дзяржавай. Мы не павінны заставацца ўбаку ад кіравання краінай. Будзем уносіць свае прапановы, складаць праекты і рэалізоўваць іх.

Мы павінны быць камунікабельнымі. З намі будзе лёгка мець зносіны. Мы цікавыя, эрудзіраваныя. Верым, што дзяржаўныя межы будуць існаваць толькі на карце, а не ў нашай свядомасці і зносінах. Такой павінна быць моладзь сёння, такой павінна быць моладзь будучыні!

**Дар'я ЛУКАШЭНЯ,**
**навучэнка Навамышскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя сельскагаспадарчай вытворчасці Баранавіцкага раёна.**

**Пра аўтара**

**— З маленства я была рухавая і завадная. Ні адно свята ў садку, пазней — у школе, не абыходзілася без майго ўдзелу. Галоўнае, што гэта заўсёды мне падабалася. Калі падрасла, энергію таксама трэба было некуды скіраваць. Так я пайшла вучыцца ў дзіцячую школу мастацтваў, клас харэаграфіі. Іграю на домбры і гітары, вельмі падабаецца танцаваць. А яшчэ люблю чытаць, асабліва класічныя творы рускай і беларускай літаратуры. Мой любімы твор — «Паўлінка» Янкі Купалы, — распавяла пра сябе Дар'я.**

**Цяпер 17-гадовая аўтарка атрымлівае ў ліцэі спецыяльнасць... «Аўтаслесар па рамонце аўтамабіляў». У дзяўчыны ёсць правы кіроўцы, так што атрыманыя навыкі ёй могуць спатрэбіцца ў будучыні. А вучыцца далей Дар'я плануе ў вышэйшай навучальнай установе па спецыяльнасці «Лагапед».**

SEX=БАЛЯСЫ

# САКРЭТЫ ФРЫТАТЫ

**Вы думаеце, што ніколі не чулі пра такую італьянскую страву? Памыляецеся, усе з нас добра ведаюць «прабабулю» гэтага амлета — звычайную яечню. А калі падсмажыць яе на сале ці з хатняй, «пальцам пханай» каўбаскай, ды з памідорчыкамі, а зверху прыцерушыць свежым зяленівам, лічыце, што беларуская фрытата ўжо ў вас на стале. Італьянская адрозніваецца хіба начынкай: апроч пералічаных інгрэдыентаў, яе гатуюць з сырам і большай колькасцю гародніны. Ды напачатку запякаюць на пліце, а потым даводзяць да гатоўнасці ў духоўцы. Але галоўны сакрэт фрытаты насамрэч не ў гэтым. Але пра яго — пасля. Напачатку будзе адна гісторыя.**

Нядаўна ўвесь свет, без перабольшвання (а з інтэрнэтам зараз па-іншаму і не бывае), абляцела навіна пра сужэнцаў з Нью-Ёрка. Праславіліся яны тым, што, не знайшоўшы паразумення паміж сабой, вынеслі на ўсеагульнае абмеркаванне і нават галасаванне... імя свайго дзіцяці. Заўважу, яшчэ не народжанага. Дык вось, калі маладая жанчына (між іншым, наша зямлячка з Маладзечна) паведаміла сужэнцу-грэку, што цяжарная, паміж імі пачалася спрэчка пра тое, як назваць немаўля. Па словах будучай маці, муж настойвае, што калі будзе сын, даць яму імя Спірыдон. Так звалі бацьку мужчыны, а ў Грэцыі модна называць першынца ў гонар дзеда. А жанчыне гэтае імя ну зусім не падабаецца, яна кажа, што яго нават вымавіць цяжка. Самой ёй больш даспадобы імя Міхаіл — у гонар ужо свайго бацькі. («Жаночая логіка — дзіўны прадмет. Скандал ужо ёсць, а прычыны яшчэ няма». У нашым выпадку — у прамым сэнсе гэтых слоў). Ну, і панеслася. Ужо сужэнец пачаў гаварыць, што на выбар жонкі аказвае ўплыў яе савецкае мінулае з тагачаснымі «варварскімі» (!) імёнамі. («Я і не ўяўляла, што ты такі цікавы мужчына!» — «Дык спытала б у мяне, я б расказаў»).


Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

Больш за тое, ён нават абвінаваціў другую палавіну ў тым, што яна парушае папярэднія дамоўленасці адносна таго, што імёны сынам будзе даваць ён, а дочкам — жонка. Не ведаю, як там насамрэч сітуацыя з дамоўленасцямі, але такі падыход нагадвае чарговы анекдот. Памятаеце? «У спрэчцы сапраўднага мужчыны і сапраўднай жанчыны заўсёды перамагае той, хто першы заплача».

Не, вядома, у кожнага з нас ёсць свае прынцыпы. Але ж іх неяк палюбоўна вырашаць трэба. Вось, напрыклад, ваш пакорны слуга некалі насіў доўгія валасы, збіраўся прабіць вуха і купіць каўбойскія боты. А выбранніца сказала катэгарычнае «не». Больш за тое, папярэдзіла, што возьме гэта смешнае прозвішча Хацелавай-Змагелавай толькі пры ўмове, калі я пастрыгуся. Што было рабіць? Як у тым даўнім анекдоце пра дзённік «новага рускага»: «На ноч перачытваў пэйджар. Шмат думаў». Надумаў. Пайшлі ў цырульню разам. Я ўзяў з сабой фотаапарат, кажу, трэба на памяць здымкі зрабіць. Ходзім, здымаемся, я то ракурс лаўлю, то сонца... Вечарэла, як казаў некалі сатырык Задорнаў. І тут мая абранніца ўцяміла, што гэта я такім чынам час цягну, чакаю, пакуль цырульня зачыніцца. «Хацелаў-Змагелаў! Яна дапазна працуе, так што пайшлі!» Затое ў жонкі — маё прозвішча...

Але вернемся да нашай гісторыі. Не знайшоўшы паразумення, сужэнцы вырашылі прыцягнуць на дапамогу інтэрнэт-карыстальнікаў. (У сацыяльнай сетцы. «Чаму ты мяне з сяброў выдаліла?» — «Таму, што ты мяне прыводзіш у шаленства!» — «А нічога, што мы з табой жанатыя?!.») Яны запусцілі ў сеціве зварот з умовай, што калі не менш за сто тысяч чалавек выкажуцца на карысць імя Спірыдон, так таму і быць. Адкуль такая лічба? Па словах будучай маці, прыкладна столькі жыхароў пражывае ў яе родным Маладзечне. («Жонцы ўжо і самой надакучыла крычаць на мужа, але тут ён папрасіў яе супакоіцца...»).

З цягам часу мая жонка вынайшла свой рэцэпт фрытаты. Страва патрабуе шмат інгрэдыентаў: вяндліна або сасіскі, цвёрды і плаўлены сыры, памідоры, гуркі, салодкі балгарскі перац, смятана, зяленіва... Каштуе гэта нятанна, патрэбныя прадукты шукаюцца загадзя, гатуецца страва таксама не вельмі хутка, таму дазволіць яе сабе можна нават не на кожныя выхадныя. Затое які водар пачынае лунаць па кватэры, калі яна запякаецца! Стравай на тры пальцы таўшчынёй з вялікай патэльні за раз можна накарміць — абавязкова пад лаваш ці багет — чалавекі чатыры-пяць. Фрытата вельмі смачная як гарачая, так і халодная. Але не спяшайцеся набівацца ў госці — і вось чаму...

Вы часам не глядзелі амерыканскі фільм «Добрай раніцы»? Тэлепрадзюсара-дзяўчыну звальняюць з праграмы мясцовых навін, і яна ўладкоўваецца ў не вельмі папулярнае ранішняе шоу. Спрабуючы яго рэанімаваць, яна запрашае легендарнага вядучага Майкла Памероя, ролю якога выконвае Харысан Форд (дарэчы, хто не ведае, яго продкі — з Беларусі). Цягам стужкі мы назіраем, як паміж зусім рознымі людзьмі паступова наладжваюцца цёплыя сяброўскія і прафесійныя стасункі. Галоўны герой у нейкі момант выходзіць са сваёй «ракавіны» і дзеліцца рэцэптам прыгатавання менавіта фрытаты. І вось, увага, абяцаны галоўны сакрэт гэтай стравы! У вуснах нашага героя ён гучыць так: «Але толькі для тых людзей, якіх я па-сапраўднаму люблю...» Для мяне жончына страва — сімвал дома, сям'і, утульнасці, клопату.

Вяртаючыся зноў да гісторыі з імем яшчэ не народжанага дзіцяці, думаецца — галоўнае ў ёй тое, каб «фрытата» была прыгатаваная з любоўю. «Кім ты хочаш стаць, калі вырасцеш?» — «Шчаслівым!» — «Ты не зразумеў майго пытання». — «Ты не зразумеў майго адказу»...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «КАЛІ ВЫЙДУ ЗАМУЖ, ТО НАЗАЎЖДЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



Мне прыемна, што людзі, з якімі я маю стасункі, у тым ліку і тыя, з кім працую ў Тэатры эстрады, парадаваліся за мяне ў гэтай сітуацыі і зараз пытаюцца пра далейшае развіццё падзей. Такая падтрымка дае сілы і робіць цябе больш упэўненай.

***— Далёка ўдалося зайсці на праекце?***

— Яшчэ рана абмяркоўваць гэтае пытанне, таму што «Голас...» у самым разгары. Зусім хутка, здаецца, у сярэдзіне ці ў канцы мая, пачнуцца прамыя эфіры. Магу толькі сказаць, што этап накаўтаў будзе вельмі эмацыянальным, з вялікім напружаннем. У прыватнасці ў маёй пары. Гледачоў чакае прыемнае здзіўленне...

**«Па дарозе да сталіцы мы перажываем асобнае жыццё, напрацоўваючы вопыт па меры набліжэння да сваёй мэты. І нават у 20 гадоў у мінчаніна і прыезджага ён будзе розным, бо несталічны жыхар быў у дзеянні, у руху. Гэта надае людзям больш выжывальнасці ў нейкіх сітуацыях».**

***— Раскажыце, як вам працавалася з Аляксандрам Панамаровым?***

— Мы прыязджалі на рэпетыцыі з іншай краіны, у чым былі пэўныя нязручнасці. Бо ў кожнага свая праца тут і часта ездзіць у Кіеў не атрымлівалася, таму працавалі амаль што завочна. Прыязджаеш на рэпетыцыі, паказваеш зробленае і атрымліваеш далейшыя ўказанні. Аляксандр — чалавек, які мае багаты вопыт як кампазітар, выканаўца, таму заўсёды ёсць да чаго прыслухацца і нешта ўзяць сабе на заметку. Але на сустрэчах ён накіроўваў мяне ў плане эмацыянальнасці і таго, як зрабіць так, каб песня дыхала пачуццямі.

***— А вы эмацыянальны чалавек па-за сцэнай?***

— Вельмі. Магу нават, абмяркоўваючы нейкае пытанне, вельмі бурна рэагаваць, гучна гаварыць. І часам людзям здаецца, быццам я сваруся. Але гэта нармальна для таго, хто «працуе» голасам. Яшчэ я часта плачу ў кіно. Некалі паказвалі фільм «Белы Бім Чорнае вуха» і я не проста плакала, а гадзіны тры пасля ў сябе прыходзіла ад уражанняў.

***— А ці можна застацца сябрамі пасля кахання?***

— Калі сувязь з былым хлопцам падтрымліваецца, то ў гэтым прысутнічае тэатральнасць. Мне, напрыклад, будзе непрыемна ведаць пра стасункі майго маладога чалавека з былой дзяўчынай. І, мабыць, калі мне непрыемна, то і той, хто побач са мной, не будзе ў захапленні ад такой сітуацыі. Была ў вашым жыцці нейкая гісторыя — пакіньце яе ў мінулым. Паверце, так усім будзе спакайней.

***— Некалі вы марылі пра сям'ю і дзяцей. Ці змяніліся вашы жыццёвыя ўстаноўкі?***

— Зараз да паняцця «сям'я» я стаўлюся больш асцярожна. Разумею, што калі выйду замуж, то ўжо назаўжды. Хочацца, каб побач быў той, хто будзе мяне разумець і падтрымліваць. Тым больш улічваючы маю эмацыянальнасць і спецыфіку прафесіі. І, безумоўна, гэты чалавек павінен быць годным прыкладам для маіх дзяцей, каб яны ганарыліся ім.

З кожным годам станаўлюся больш хатняй. Раней я была вельмі лёгкай на пад'ём. А зараз без праблем адмоўлюся ад паходу на нейкую вечарынку на карысць праведзенага дома вечара. Выхадныя на фестывалі ці паездка на лецішча? Выберу апошняе. А некалькі гадоў таму я нават не задумвалася над гэтым. Кідалася ў вір нейкіх паездак, тусовак, новых знаёмстваў. Цяпер для мяне дом важнейшы за ўсё тое, што маем мы, артысты, па-за яго сценамі.

***— Такая пазіцыя выклікае павагу, але калі артыст не на вачах, то заўтра пра яго могуць не ўспомніць...***

— Наша эстрада не на такім узроўні, калі не абысціся без піяру за кошт скандалаў альбо чагосьці іншага. Я не Філіп Кіркораў, каб думаць пра тое, як падагрэць зацікаўленасць да сваёй асобы, а дастаткова сціплы чалавек... Не ўмею штурхацца локцямі... Калі нешта павінна стаць маім — так і будзе. А вышэй галавы не скочыш.

***— Неяк вы агучылі такую думку: «Чым больш кіламетраў чалавек праехаў да сталіцы, тым лепш». Патлумачце сваю пазіцыю...***

— Сталічны жыхар прызвычаіўся да таго, што ён тут і яму не трэба змагацца за месца пад сонцам. Часам з-за такога меркавання людзі не скарыстоўваюць на поўную свае магчымасці. А чалавек здалёку зробіць усё, каб зачапіцца ў Мінску і здзейсніць задуманае. Наогул, па дарозе да сталіцы мы перажываем асобнае жыццё, напрацоўваючы вопыт па меры набліжэння да сваёй мэты. І нават у 20 гадоў у мінчаніна і прыезджага ён будзе розным, бо несталічны жыхар быў у дзеянні, у руху. Гэта надае людзям больш выжывальнасці ў нейкіх сітуацыях.

**«Не ўмею штурхацца локцямі... Калі нешта павінна стаць маім — так і будзе. А вышэй галавы не скочыш».**



***— Зараз вы адчуваеце сябе сталічнай дзяўчынай?***

— З аднаго боку, ужо так, але з іншага — яшчэ дагэтуль не вывучыла горад дасканала. Аднак, калі бываю ў гасцях у маці ў Наваполацку, то не адчуваю, што горад мой. Там проста жывуць мае родныя, а ў Мінск я вяртаюся, як дадому. Калі мне тэлефануюць людзі з мінулага, то адчуваю настальгію. Але не хацела б вярнуцца ні ў адзін з перыядаў свайго былога жыцця.

**Алена ДРАПКО.**

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.007.
Нумар падпісаны ў 19.30 06.05.2015 г.

# З КЛОПАТАМ ПРА АГУЛЬНАЕ БАГАЦЦЕ

## Штрыхі да «партрэта» Шчучынскага лясгаса

**Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў Шчучынскім лясгасе і пераканаліся, што выдатныя прыродныя рэсурсы тутэйшых мясцін знаходзяцца пад пільным клопатам сапраўдных прафесіяналаў лясной гаспадаркі.**


Пасадку сасны і бярозы з дапамогай «мяча Колесава» праводзяць леснікі Шчучынскага лясніцтва Уладзімір МІСЬКЕВІЧ, Юзаф НАВАГРОДСКІ, Станіслаў РУДЫ і Іван ПАЎЛОВІЧ.

### АД КОНЕЙ — ДА ВЫСОКАТЭХНАЛАГІЧНЫХ МАШЫН

**Дакладную дату ўтварэння Шчучынскага лясгаса ўстанавіць не ўдалося, бо ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі Беларусі значная частка дакументаў была знішчана. Але дакладна вядома: у 1939 годзе выйшла пастанова Саўнаркама СССР па БССР аб арганізацыі шэрагу лясгасаў, у тым ліку і Шчучынскага. Таму лічыцца, што яго гісторыя пачынаецца з верасня 1939 года.**

У першыя пасляваенныя гады аснову лясгаса складаў... не лес, а «пераворанныя» снарадамі, бомбамі і мінамі, перасечаныя акопамі, бліндажамі і траншэямі пусткі. Лес чакаў дапамогі ад людзей. Вялізныя плошчы былі засеяны і засаджаны ляснымі культурамі дзякуючы падрыхтоўцы глебы коньмі, а сяўбу і пасадку выконвалі ўручную. Толькі ў канцы 1960-х гадоў у лясгасах пачала з'яўляцца механізаваная тэхніка, якая значна аблегчыла працу лесаводаў.

Сёння матэрыяльна-тэхнічная база лясгаса — на сучасным узроўні. Налічваецца каля 50 адзінак тэхнікі самага рознага профілю, у тым ліку сартыментавозы, трэскавозы (лясгас займаецца вытворчасцю мясцовага паліва — трэсак), аўтамабілі спецыяльныя і для падвозкі людзей, трактары колавыя і з цялежкамі, харвэстары і фарвардар.

Акрамя таго, на аснашчэнні лясгаса цяпер каля 100 бензапіл. Але гэта зусім не азначае, што асноўнай задачай з'яўляецца высечка лесу.

— Бытуе меркаванне, што леснікі толькі высякаюць дрэвы. Гэта няправільна. Мы садзім лесу значна больш, чым ідзе пад высечку. Калі, дапусцім, за год высякаем 150—200 гектараў, то дынаміка пасадкі дрэў, з улікам перадачы ў наша карыстанне новых плошчаў, якія нявыгадна задзейнічаць у сельскагаспадарчай вытворчасці, можа дасягаць 400 і нават 600 гектараў, — зазначае **намеснік дырэктара Шчучынскага лясгаса па ідэалагічнай рабоце Андрэй МІНЬКОЎ.**

Ужо крылатая фраза, што ўсход — справа тонкая, у поўнай меры адносіцца і да лясной гаспадаркі. Раз на 10 гадоў праводзіцца лесаўпарадкавальная экспедыцыя, якая дакладна вызначае ўсе аспекты развіцця тэрыторыі лясгаса — ад пасадак новых дрэў да розных відаў іх высечкі, догляду лясных культур. Дарэчы, лес да ўзросту суцэльнай высечкі расце больш за 80 гадоў. Садзім сёння, а карыстацца ім у гаспадарчых мэтах будуць нашы дзеці і ўнукі. Аднак, каб лес дасягнуў аптымальнага стану, людзі ў сваёй рабоце павінны ўлічваць прынцыпы натуральнага прыроднага адбору. Прыбіраць дрэвы, якія адсталі ў росце, пацярпелі ад насякомых-шкоднікаў і катаклізмаў надвор'я.

Тым самым забяспечваюцца лепшыя ўмовы для развіцця іншых дрэў. І, разам з тым, маем эканамічную выгаду — сыравінную базу для самых розных вырабаў, якія запатрабаваны не толькі айчыннымі, але і замежнымі пакупнікамі. У прыватнасці, Шчучынскі лясгас адгружае сасновыя, яловыя і бярозавыя балансы (драўніну дробнага дыяметра) Светлагорскаму цэлюлозна-папяроваму камбінату і іншым спажыўцам. Таксама з дробнатаварнай драўніны вырабляюць тарныя дошчачкі і трэскі, што ідуць на экспарт, а таксама запатрабаваны ў кацельнях нашай жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

### ПАРАДАК У ЛЕСЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД УСІХ НАС

На думку Андрэя Мінькова, апошнім часам ёсць станоўчая дынаміка ў разуменні людзьмі сваёй адказнасці перад нашым агульным багаццем — лесам. Але, на жаль, праблема яго засмечвання, нягледзячы на афіцыйна абсталяваныя месцы адпачынку і шчыты з заклікамі прыбраць за сабой, па-ранейшаму даволі вострая. І тут, як і ў лесанасеннай справе, могуць таксама дапамагчы сучасныя тэхналогіі.

Лясгас ужо закупіў некалькі фотапастак для фіксацыі парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства. Прычым месцы іх устаноўкі будуць мяняцца. Інфармацыя з гэтых прыбораў праз інтэрнет трапіць да супрацоўнікаў лясгаса. Плануецца, што ў бліжэйшы час такія фотапасткі будуць у кожным лясніцтве.

Зрэшты, павага да прыроды выхоўваецца не толькі выяўленнем і пакараннем яе крыўдзіцеляў. У Шчучынскім лясгасе вельмі важным лічаць найперш партнёрства з моладдзю. У сямі навучальных установах створаны і актыўна працуюць школьныя лясніцтвы. Дзеці ўдзельнічаюць у конкурсах па прыродаахоўнай тэматыцы, іх запрашаюць у лясгас для знаёмства з асновамі лясной гаспадаркі. Сёлета ў рамках «Тыдня лесу» юныя лесаводы разам са спецыялістамі лясгаса заклалі дэндрарый плошчай 0,6 гектара і алею з 70 дрэў з нагоды юбілею Вялікай Перамогі.

Вядома, не кожны з гэтых школьнікаў будзе ў далейшым працаваць у лясной гаспадарцы. Але ў любым выпадку ўрокі паважлівых адносін да прыроды ім дапамогуць у дарослым жыцці. Тым жа, хто хоча звязаць свой лёс з прафесіяй лесавода ці дрэваапрацоўшчыка, лясгас дае мэтавае накіраванне ў ВНУ з гарантыяй далейшага працаўладкавання. Дарэчы, у гаспадарцы ёсць работнікі з толькі адным запісам у працоўнай кніжцы — «Шчучынскі лясгас»: **ляснічы Анатоль Канстанцінавіч ПАНАСЕВІЧ, майстар лесу Станіслаў Міхайлавіч КРУПІЦА і іншыя.**

### СУЧАСНЫ ПАДЫХОД ДА... ШЫШАК

У Шчучынскім лясгасе ўражвае падыход да... звычайных шышак. Лесанасенны цэх, дзе задзейнічана сучасная шведская тэхналогія, уведзены ў эксплуатацыю тры гады таму. Ён забяспечвае перапрацоўку шышак хваёвых парод усіх лясгасаў Гродзеншчыны і іншых рэгіёнаў, штогадовы аб'ём складае 80-100 тон.

— Напрыклад, вось гэтыя сасновыя шышкі прывезлі з Ваўкавыска, а гэтыя, яловыя — з Оршы. Будзем перапрацоўваць і класці атрыманае насенне на захоўванне, — кажа **начальнік лесанасеннага цэха Аляксандр ТРАХІМЧЫК.**

У невялікім па плошчы цэху адбываецца поўны тэхналагічны цыкл: ад сартавання, выдалення хваёвых прымесяў і пустых шышак, сушкі насення — да яго закладкі ў халадзільную камеру. Штодзённа можна перапрацоўваць каля 500 кілаграмаў шышак і захоўваць у неабходным тэмпературным рэжыме да 10 тон насення, што складае запас абласнога лесагаспадарчага аб'яднання на 3-4 гады. Усходжасць такога насення дасягае ўзроўню 92-95%.

Акрамя таго, у лясгасе развіваюць тэхналогію вырошчвання пасадачнага матэрыялу ў закрытай каранёвай сістэме, што робіць яго прыжывальнасць практычна стапрацэнтнай.

Потым мы ўбачылі, як адбываецца пасадка дрэў, а таксама нам паказалі лясны гадавальнік куліснага тыпу агульнай плошчай 20 гектараў. Вось, напрыклад, будучыя навагоднія елкі. А ўвогуле цяпер вырошчваюць каля 25 найменняў дрэўных і куставых парод. Летась у гадавальніку вырасцілі больш за 3,7 мільёна сеянцаў і саджанцаў, усе працэсы максімальна механізаваны.


Сеянцы лістоўніцы накіроўваюцца на пасадку ў Пескаўскае лясніцтва: работніца гадавальніка Крысціна ПІЛЬЧУК, работнікі Пескаўскага лясніцтва — вадзіцель Аляксандр ШАПАВАЛ і ляснік Юрый ЛОЙКА.

**ДЛЯ ДАВЕДКІ:**

*Сёння лясгас размяшчаецца ў межах трох адміністрацыйных раёнаў Гродзеншчыны — Шчучынскага, Мастоўскага і Лідскага. Яго працягласць з поўначы на поўдзень — 66 кіламетраў, з захаду на ўсход — 65. Плошча лясного фонду на пачатак сёлетняга года склала 101,1 тысячы гектараў, у тым ліку 89,4 тыс. га — пакрытая лесам. На тэрыторыі лясгаса знаходзяцца ландшафтны заказнік «Ліпічанская пушча»(вялікі лясны масіў у міжрэччы Нёмана і Шчары), геалагічны і палеанталагічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння «Пескаўскае агаленне рачных адкладаў», гідралагічны заказнік мясцовага значэння «Гамшар». У саставе лясной гаспадаркі 11 лясніцтваў, цэх перапрацоўкі драўніны, рамонтна-механічныя майстэрні, лесанасенны цэх, гадавальнік і лесапаляўнічая гаспадарка.*


Як атрымаць з шышкі якаснае насенне? Аб гэтым клапоцяцца майстар лесанасеннага цэха Кацярына РАКЕЦКАЯ і падсобная работніца Данута ПАНАСЕВІЧ.

### ДА ПАСЛУГ ПАЛЯЎНІЧЫХ І ТУРЫСТАЎ

Апошнім аб'ектам нашага падарожжа па Шчучынскім лясгасе стаў Дом паляўнічага на ўскраіне вёскі Зачэпічы ў маляўнічым сасновым бары, побач з музеем — партызанскай зямлянкай. Непадалёк працякае Нёман, дзе можна палюбавацца хараством пойменных дуброў. Для паляўнічых і проста турыстаў лясгас пабудаваў двухузроўневы драўляны дом, дзе створаны камфортныя ўмовы для адпачынку. Прыехаць сюды можна не толькі дзеля здабычы паляўнічых трафеяў, але і на фотапаляванне на жывёл і птушак з назіральных вышак, а таксама на «ціхае паляванне» ў грыбных мясцінах. Па жаданні гасцей ім прапануюць у наваколлі пешыя маршруты, веласіпедныя прагулкі, сплаў на байдарках, экскурсіі па гістарычных аб'ектах Шчучынскага раёна.


Дом паляўнічага: цудоўныя ўмовы для адпачынку на любы густ.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

УНП 500191970

■ Вы прасілі расказаць

# КАБ ПАСЫЛКІ ДАХОДЗІЛІ ХУТЧЭЙ

## Журналісты «Звязды» прасачылі шлях міжнароднай карэспандэнцыі на мытні

**На прадпрыемства «Мінская пошта» сцякаюцца ўсе міжнародныя паштовыя адпраўленні, адрасаваныя ў Беларусь. Тут іх апрацоўваюць, сартуюць, адсюль адпраўляюць ва ўсе рэгіёны краіны. Але пасля таго, як яны пройдуць мытны кантроль, бо некаторыя з адпраўленняў затрымліваюцца пільнымі супрацоўнікамі...**

Мы знаходзімся ў зале мытнага кантролю, дзе ляжыць невераднагая колькасць пасылак і пакетаў. Нягледзячы на гэта, работа, дакладна раздзеленая на некалькі этапаў, ідзе зладжана. Пачынаецца яна з таго, што кожны пакет уносяць у камп'ютарную базу звестак пры дапамозе сканера. Унесці трэба прозвішча і імя атрымальніка, яго адрас, а таксама найменне, вагу і кошт тавару ў пасылцы. І якраз тут пачынаюцца першыя цяжкасці: адпраўнік, напрыклад, не ўказаў поўнае імя, адрас ці характарыстыку тавару. Калі ўзнікаюць падобныя моманты, супрацоўнік, які заносіць тавар у базу, адкладвае адпраўленне ў асобны кошык і апавяшчае пра гэта атрымальніка. Той павінен удакладніць неабходныя звесткі і, паколькі яго карэспандэнцыя самарудзіла ўвесь абарот адпраўленняў на гэтым этапе, заплаціць збор у памеры 28 тысяч рублёў, які збірае «Белпошта».

Далей адпрацоўваюцца так званыя рызыкі: дробныя пакеты вагой да двух кілаграмаў сканіруюць, звяраюць з рэестрам у камп'ютары і высвятляюць, ці спрабавалі раней грамадзяне атрымліваць па пошце забароненыя для ўвозу тавары. Сярод іх — алкаголь, тытунёвыя вырабы і курыльныя сумесі, любыя віды зброі, радыеактыўныя матэрыялы, культурныя каштоўнасці, тавары, якія хутка псуюцца, жывёлы, акрамя некаторых, і расліны, каштоўныя камяні (калі яны не ў ювелірных вырабах), наркатычныя і псіхатропныя сродкі (у тым ліку ў выглядзе лекаў), азонаразбуральныя рэчывы. Тут жа кантралююць частату ўвозу і кошт тавараў: цягам месяца адзін адрасат можа атрымліваць адпраўленні вагой да 31 кілаграма і на суму, не больш за 200 еўра, інакш давядзецца плаціць пошліну. Як правіла, большасць паштовых адпраўленняў не выклікае падазрэнняў у мытнікаў. Аднак бываюць і выключэнні. Праўда, розныя хітрыкі вопытныя супрацоўнікі бачаць адразу і адпраўляюць карэспандэнцыю на дадатковы агляд. Вось і цяпер **старшы інспектар аддзела мытнага кантролю Сяргей ПРАХОРЫК** насцярожваецца: на адным адпраўленні пазначана, што ў ім знаходзіцца новы тэлефон з інтэрнэт-крамы коштам 18 долараў і 20-доларавая камера. Кошт прыладаў яўна заніжаны, таму інспектар «прасвечвае» адпраўленне рэнтгенам.

— Мы бачым, што ў адпраўленні камера з правадамі для падключэння і тэлефон, — каментуе выяву на экране камп'ютара Сяргей Прахорык. — Паштовыя аператары ўскрыюць гэтае адпраўленне і прад'яўяць мытнаму інспектару, які ацэніць яго і прыме рашэнне на паглыбленым аглядзе.

На наступным этапе правяраюць пасылкі ад трох да 27 кілаграмаў. На экране ў супрацоўніка — змест 14-кілаграмовай пасылкі з Італіі: сілуэты абутку, кансерваў, адзення, цукерак. А ў наступнай пасылцы эксперт заўважае сілуэт бутэлькі. Гэта можа быць, напрыклад, «бяскрыўдны» аліўкавы алей, а можа — і забаронены да перасылкі алкаголь. Таму з тэхнічнага кантролю гэтае адпраўленне таксама паступіць на ручны агляд. Калі ў пасылцы не знойдуць нічога забароненага, яна працягне свой шлях да атрымальніка. У адваротным выпадку складуць акт агляду і пасылку адашлюць назад адпраўніку.

Дарэчы, кожнае рабочае месца ў зоне мытнага агляду абсталявана відэакамерай, а распячатванне адпраўленняў праходзіць пры ўдзеле камісіі і таксама пад відэаназіраннем. Так што калі ў грамадзяніна ўзнікнуць прэтэнзіі наконт цэласнасці яго пасылкі, то ўсё можна лёгка праверыць, з дапамогай адпаведнага відэазапісу. Да таго ж вагу кожнага адпраўлення паштовая служба кантралюе да грама. Калі выяўляецца нейкая неадпаведнасць, яна таксама дакументуецца.

Далей супрацоўнік мытні па наклееных на адпраўленнях дэкларацыях адбірае тыя, якія чакае паглыблены ручны агляд. З 40 тысяч пасылак, што апрацоўваюць за дзень, у 40-50 знаходзяць парушэнні. Пры распячатванні ўстанаўліваюць, рэчы ў пасылцы сапраўды прызначаны для асабістага карыстання ці іх даслалі на продаж. Бо на што толькі ні ідуць некаторыя, каб не плаціць пошліну: і па некалькі адпраўленняў запісваюць на адзін адрас, і змяняюць прозвішча на некалькі літар, і забароненыя рэчы хаваюць і маскіруюць самымі фантастычнымі спосабамі. За першы квартал года ўжо заведзена восем крымінальных спраў па фактах увозу ў Беларусь псіхатропных рэчываў. Апроч таго, мытнікі адзначаюць, што апошнім часам без дакументаў і дэкларавання сталі больш увозіць халоднай зброі, дубінак, замежнай валюты, сродкаў тайнага атрымання інфармацыі, замаскіраваных пад іншыя прадметы. Так, мы вельмі здзівіліся, калі сярод вынятых пры аглядзе рэчаў убачылі электрычныя ліхтарыкі. Чаму іх нельга правозіць? Аказалася, што гэта зусім не ліхтары, а электрашокавыя прылады...





Усяго ў зоне мытнага кантролю — 18 працоўных месцаў. У дні найбольшага патоку адпраўленняў (напрыклад, у навагоднія святы) колькасць супрацоўнікаў тут павялічваецца ўдвая. Усё больш ім давядзіцца апрацоўваць пасылак з Кітая (у 2013 годзе яны складалі 54% ад усіх міжнародных адпраўленняў, летась — ужо 70%). Збольшага гэта электронныя, мабільныя прылады і іншая тэхніка. Лідары па заказах рэчаў з-за мяжы — Мінск і Мінская вобласць (больш за 50% атрымальнікаў), на другім месцы (14%) — Гомельская вобласць.

— Летась у Беларусь паступіла 6,5 млн міжнародных паштовых адпраўленняў на суму 58 млн долараў. А за першы квартал сёлета ўжо паступіла 2,6 млн адпраўленняў, — распавёў **начальнік Мінскай рэгіянальнай мытні Аляксандр БАГДЗЕВІЧ**.

Аб'ёмы міжнародных пасылак павялічваюцца: калі летась фізічныя асобы пры дапамозе паштовых адпраўленняў атрымалі тавараў на суму каля 60 млн еўра, то за першы квартал 2015 года сума ўжо склала 40 млн. Такая сітуацыя прымушае мытнікаў і паштавікоў прымаць дадатковыя меры па апрацоўцы карэспандэнцыі.

— 1 чэрвеня плануецца адкрыццё яшчэ аднаго пункта міжнароднага паштовага абмену на тэрыторыі Нацыянальнага аэрапорта «Мінск» у зоне дзейнасці мытні «Мінск-2», — праанансаваў падзею **намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір АРЛОЎСКІ**. — Калі частка адпраўленняў, якія прыбываюць авіятранспартам, будзе афармляцца непасрэдна ў аэрапорце, скароцяцца мытныя аперацыі, а таксама пэўныя аперацыі пошты.

Па меркаванні Уладзіміра Арлоўскага, каля 30% авіяадпраўленняў будуць афармляць у аэрапорце, а да канца года, магчыма, іх колькасць павялічыцца да 50%.

Такім чынам ёсць надзея, што свае адпраўленні беларусы будуць атрымліваць хутчэй. Дарэчы, многія папракаюць работнікаў пошты за тое, што карэспандэнцыя ідзе доўга. І дарэмна, бо час не шляху залежыць ад мноства складнікаў.

— З моманту пакупкі тавару ў пэўнай краіне інтэрнэт-крама нейкі час яго запакоўвае і перадае паштоваму аператару краіны адпраўлення. Далей — перавозка. Зразумела, калі гэта Кітай, то адпраўленне пройдзе праз два-тры транзітныя аэрапорты. Аднак усе аператары стараюцца выбраць лагістыку з мінімальным тэрмінам праходжання да краіны прызначэння. Пасля таго, як адпраўленне паступіла ў Нацыянальны аэрапорт «Мінск» (на сённяшні дзень авіятранспартам дастаўляецца 70% адпраўленняў), цягам сутак яго прывозяць у пункт міжнароднага паштовага абмену. Яно апрацоўваецца 2-3 дні — у залежнасці ад таго, як афармлена адпраўленне. Далейшая дастаўка ажыццяўляецца ў залежнасці ад пункта прызначэння ад аднаго да трох дзён (у самы далёкі куток краіны), — распавяла **першы намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства «Белпошта» Алена СКРЫПЧЫК**.

Тэрміны мытнага афармлення, калі не ўзнікае пытанняў, таксама 1-2 дні. Для большай зручнасці кліентаў пасылкі і EMS-адпраўленні дастаўляюцца атрымальніку непасрэдна на дом. Дробныя пакеты выдаюцца або ў паштовых аддзяленнях, або ў спецыялізаваных пунктах выдачы (іх у краіне цяпер больш за 15). Аднак пры жаданні кліент можа скарыстацца і дадатковымі паслугамі, напрыклад, замовіць кур'ера і ўзгадніць час дастаўкі. Безумоўна, гэтыя паслугі тарыфікуюцца. Апроч таго, на сайце «Белпошты» можна адсочваць шлях свайго паштовага адпраўлення ў рэжыме анлайн.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**



Фота Надзеі БУЖАН.

**ТЭЛЕГРАФНЫМ РАДКОМ**

**Сёння — у Дзень работнікаў радыё, тэлебачання і сувязі — шчыра віншуем нашых калег, нашых дзелавых партнёраў-паштавікоў з прафесійным святам! Моцнага здароўя ўсім (і кожнаму!), поспехаў — у вельмі няпростай, але такой патрэбнай людзям працы, згоды і дабрабыту ў сем'ях! А яшчэ — вясновага настрою... на ўвесь год!**

**ЗВЯЗДОЎЦЫ.**

■ На слыху

# Мабільная сувязь чацвёртага пакалення — да канца года

**Паслугі на аснове найноўшых тэхналогій LTE (4G) гатовы прапанаваць суайчыннікам адзін з найстарэйшых аператараў — Velcom.**

Паводле слоў генеральнага дырэктара кампаніі Гельмута Дуза, стандарт сучаснай мабільнай сувязі чацвёртага пакалення можа быць запушчаны ў Мінску і абласных цэнтрах ужо цягам 2015 года — у выпадку, калі ад рэгулятара будзе атрымана ліцэнзія на выкарыстанне адпаведных частот. «Мы, са свайго боку, да запуску сеткі цалкам падрыхтаваныя, — падкрэсліў спадар Дуз, — што дазволіць прапанаваць карыстальнікам найхутчэйшую ў краіне перадачу даных і пашыраныя магчымасці па нізкіх цэнах. Ужо сёння каля 200 тысяч нашых абанентаў валодаюць прыладамі, што падтрымліваюць стандарт LTE». Пры гэтым кампанія, дадаў яе кіраўнік, не бачыць сябе манапалістам у гэтай сферы — наадварот, чым больш будзе канкурэнцыя, тым больш якасныя паслугі сувязі ў выніку атрымаюць спажыўцы.

Акрамя таго, Velcom афіцыйна паабяцаў палепшыць і паскорыць працу свайго кол-цэнтра — у выпадку, калі абанент вымушаны чакаць адказу сэрвіснай падтрымкі больш як 3 хвіліны, ён атрымае выбачэнні ад аператара ў выглядзе 100 Мб бонуснага інтэрнэт-трафіка. «А калі ваша пытанне раптам засталося нявырашаным, можна звяртацца наўпрост да мяне праз электронную скрыню duhs@velcom.by, і я абяцаю адказаць кожнаму», — запэўніў абанентаў генеральны дырэктар Velcom.

Кіраўніцтва кампаніі, дарэчы, афіцыйна паабяцала сёлета працягнуць сацыяльна значныя праекты, сканцэнтраваўшыся на двух вектарах: клопат пра дзяцей (маюцца на ўвазе найперш шматлікія дабрачынныя ініцыятывы) і падтрымка беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці (у тым ліку самабытных мастацкіх і музычных праектаў, выкарыстанне беларускай мовы ў рэкламе і г.д.).

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■

Даты Падзеі Людзі

## 7 МАЯ

*У краіне адзначаецца прафесійнае свята — Дзень работнікаў радыё, тэлебачання і сувязі. 120 гадоў таму ў гэты дзень у 1895 годзе рускі фізік і электратэхнік А.С. Папоў упершыню прадэманстраваў прыбор, здольны ўлоўліваць радыёхвалі — гэта быў прататып сучаснага радыёпрыёмніка. І хоць на першай дэманстрацыі не было перадатчыка (ён з'явіўся толькі праз год), менавіта гэты дзень лічыцца днём нараджэння радыё.*



**1350** год — сёлета спаўняецца 665 гадоў з дня нараджэння (1350—1430) Вітаўта, князя гродзенскага і трокскага, вялікага князя ВКЛ. Увайшоў у гісторыю як адзін з самых выдатных дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага. Праводзіў палітыку цэнтралізацыі і ўмацавання асабістай улады. Вёў актыўную знешнюю палітыку. За час свайго кіравання значна пашырыў тэрыторыю дзяржавы. У Грунвальдскай бітве 1410 года ўзначальваў войскі ВКЛ — асноўную сілу ў разгроме крыжакоў. Пры Вітаўце Вялікае Княства Літоўскае дасягнула сваёй найбольшай магутнасці.

**1840** год — нарадзіўся Пётр Ільіч Чайкоўскі, рускі кампазітар. Першыя крокі свайго ўзыходжання на музычны Алімп ён рабіў разам з маці, а прафесійна займацца музыкай Пётр Ільіч стаў толькі па заканчэнні Пецярбургскага вучылішча правазнаўства. Потым былі гады заняткаў у Пецярбургскай кансерваторыі. У 1866 годзе кампазітар стварыў першую сімфонію, а пасля — і першую оперу. У творчасці Чайкоўскага прадстаўлены амаль усе музычныя жанры. Змест яго музыкі ўніверсальны: ахоплівае вобразы жыцця і смерці, кахання, прыроды, побыту. У ёй па-новаму раскрываюцца творы рускай і сусветнай літаратуры, у прыватнасці, Гогаля, Шэкспіра. Творчасць Пятра Ільіча яшчэ пры жыцці заслужыла прызнанне — як у Расіі, так і за мяжой. «Я хацеў бы, каб музыка мая распаўсюджвалася, каб павялічвалася колькасць людзей, якія знаходзяць у ёй суцяшэнне і апору», — такім было яго крэда.

**1929** год — нарадзіўся (вёска Доўск Рагачоўскага раёна) Яўген Аляксандравіч Казлоўскі, савецкі і расійскі дзяржаўны дзеяч і вучоны-геолаг, акадэмік Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук (1992), доктар тэхнічных навук (1973), прафесар (1974), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Расійскай Федэрацыі (1996). У 1948 годзе скончыў Мінскае артылерыйскае вучылішча, у 1953-м — Маскоўскі геолагаразведачны інстытут. У 1965—1972 гадах — начальнік упраўлення Міністэрства геалогіі СССР, з 1974 года — намеснік міністра, а ў 1975—1989 гг. — міністр геалогіі СССР.

### Было сказана

**Сяргей ГРАХОЎСКІ, паэт, празаік, перакладчык:**

*«Хто судзіць сябе не ўмее — не можа іншага судзіць».*

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Слуцк-Модуль» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества (в комплексе) в составе:**

| № | Наименование | Инв. № | Общ. пл., кв.м |
|---|---|---|---|
| 1 | Здание инженерно-бытового корпуса, инв. №98318 | 640/С-84380 | 10378,5 |
| 2 | Тепловые сети, инв. №98342 | 640/С-84368 | - |
| 3 | Площадка асфальтобетонная (инв. №98364) | 640/С-84443 | 1612,5 |
| 4 | Погрузочно-разгрузочная площадка (инв. №98365) | 640/С-84378 | 783,6 |
| 5 | Трансформаторная подстанция | 640/С-84444 | 37,7 |
| 6 | Сети водопровода (инв. №98340, инв. №98339, инв. №98341) | 640/С-84373 | - |
| 7 | Канализационная насосная станция (инв. №98330) | 640/С-84377 | 25,2 |
| 8 | Эстакада – площадка для мойки автомобилей | 640/С-84445 | - |
| 9 | Топливно-заправочный пункт (инв. №98327) | 640/С-84371 | - |
| 10 | Очистные сооружения дождевых стоков (инв. №98331) | 640/С-84365 | - |
| 11 | Градирня металлическая ККТ-35 (инв. №25301) | 640/С-84372 | - |
| 12 | Градирня металлическая ККТ-35 (инв. №25300) | 640/С-84367 | - |
| 13 | Контрольно-пропускной пункт | 640/С-84440 | 8,1 |
| 14 | Склад газовых баллонов | 640/С-84442 | 107,8 |
| 15 | Вспомогательный корпус часть, инв. №98358 | 640/С-84381 | 1353,6 |
| 16 | Объекты благоустройства | 640/С-84370 | - |
| 17 | Главный корпус, инв. №98319 | 640/С-84382 | 22590,0 |
| 18 | Здание вспомогательного корпуса, инв. №98360 | 640/С-51701 | 335,7 |
| 19 | Склад тяжелых металлов | 640/С-39784 | 634,6 |
| 20 | Здание склада | 640/С-38241 | 535,9 |
| 21 | Производственное здание-котельная, инв. №98361 | 640/С-51700 | 194,3 |
| 22 | Гараж со вспомогательным корпусом | 640/С-47756 | 1362,3 |
| 23 | Здание склада | 640/С-38242 | 2467,1 |
| 24 | Здание информационно-вычислительного центра | 640/С-38243 | 2393,6 |
| 25 | Автомонтажный корпус | 640/С-39783 | 8785,1 |
| 26 | Дренажная насосная станция (инв. №98329) | 640/С-84375 | 330,6 |
| 27 | Сети канализации (инв. №98626) | 640/С-84379 | - |
| 28 | **Оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона)** | | |

Указанные объекты расположены на земельном участке площадью **8,4478 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101. Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га. Имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у продавца и организатора аукциона).

**Начальная цена снижена на 60% и составляет без НДС – 26 100 361 600 бел. руб. Задаток 5% от начальной цены (1 305 018 080 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 690324015.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» от 13.03.2015.*

Аукцион состоится **26.05.2015** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.05.2015** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

---

БЕЛАРУСБАНК

## Вниманию держателей карточек ОАО «АСБ Беларусбанк»!

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует об установлении с 07.05.2015 по всем действующим и вновь открываемым счетам, к которым оформлены карточки БЕЛКАРТ «Сберегательная» и БЕЛКАРТ «Аграрная», следующих размеров процентов:

| | |
|---|---|
| **БЕЛКАРТ «Сберегательная»** | при сумме 0 – 3 000 000 бел. руб. – по ставке вклада до востребования |
| | при сумме 3 000 001 – 10 000 000 бел. руб. – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь минус 5 процентных пунктов |
| | при сумме 10 000 001 – 50 000 000 бел. руб. – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь минус 1 процентный пункт |
| | при сумме 50 000 001 – 100 000 001 бел. руб. – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 1 процентный пункт |
| | при сумме от 100 000 001 бел. руб. и более – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 3 процентных пункта |
| **БЕЛКАРТ «Аграрная»** | при сумме 0 – 3 000 000 бел. руб. – по ставке вклада до востребования |
| | при сумме 3 000 001 – 10 000 000 бел. руб. – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь минус 10 процентных пунктов |
| | при сумме от 10 000 001 бел. руб. и более – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь минус 5 процентных пунктов |

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

---

УНП 101015738

**РУП «Белпочта»**
**СООБЩАЕТ О ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ ЗА 1 Б.В.:**
**Гродненская обл., Островецкий р-н, д. Быстрица.**
Дополнительная информация по тел.: 8 (0152) 74-61-47.

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЙ РУП «Брестское отделение Белорусской железной дороги»

| № лота | 1 |
|---|---|
| **Наименование, местонахождение и характеристика объекта** | Право заключения договора аренды помещений общей площадью 80,8 кв.м и летней площадки площадью 62,7 кв.м (характеристика: имеются – естественное освещение, водопровод, канализация, телефонизация) в здании столовой (инв. №100/С-40000) по адресу: Брестский район, база отдыха «Белое озеро» |
| **Балансодержатель** | Транспортное республиканское унитарное предприятие «Брестское отделение Белорусской железной дороги» |
| **Начальная цена продажи (руб.)** | **2 424 000** |
| **Сумма задатка (руб.)** | 242 000 |
| **Срок аренды** | по 19.09.2015 г. |
| **Сумма арендной платы в месяц** | Помещение – 2 226 373 рубля; летняя площадка – 10 базовых арендных величин на момент заключения договора аренды |
| **Условия оплаты** | разовый платеж |
| **Размер штрафа, руб.** | 18 000 000 |
| **Условия продажи** | - для размещения бара (общественное питание и розничная торговля продовольственными товарами); - наличие минимального ассортиментного перечня продуктов питания и товаров первой необходимости; - аренда оборудования 11 ед. (основных средств) и 60 ед. инвентаря (оборотных активов); - режим работы: ежедневно не позднее 22 ч. 00 мин. |
| **Организатор аукционных торгов** | **КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»** |

**ПРИМЕЧАНИЕ:**
Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:
1. юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь:
копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
2. юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь:
легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;
копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
3. индивидуальным предпринимателем:
копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
4. физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.
При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются:
представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.
**Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.**
Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.
Право заключения договора аренды возникает у победителя аукциона с момента внесения им определенной в ходе аукционных торгов цены за право аренды нежилого помещения. Данная сумма должна быть внесена победителем в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор аренды должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
**Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов** сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 11 июня 2015 г. в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 07.05.2015 г. до 17.30 05.06.2015 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.)**
**по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**
**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**
**Сайты: www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.gki.gov.by**

---

**Многоквартирный жилой дом по пер. Инструментальному, 11а**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

УП «КАНИМИС» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства

ЗАСТРОЙЩИК – ЧТУП «КАНИМИС»

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 3 апреля 2003 года №505, в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100856965.

Юридический адрес: г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 27, корп. 2, к. 28.

Почтовый адрес: г. Минск, ул. Гвардейская, д. 10, к. 1, телефон/факс +375173060802, +375173060781, режим работы: понедельник–пятница: с 9.00 до 18.00; выходные дни – суббота, воскресенье, обед с 13.00 до 14.00.

**Ранее реализованные проекты:** Многоквартирный жилой по адресу: г. Минск, ул. Школьная, д. 16, введен в эксплуатацию в декабре 2014 года.

**Цель строительства** – исполнение инвестиционного проекта по договору № 452-Д на реализацию права проектирования и строительства объекта «Многоквартирный жилой дом по пер. Инструментальному, 11а» от 21.12.2012 г. с Минским городским исполнительным комитетом.

**Объект строительства** – Многоквартирный жилой дом по пер. Инструментальному, 11а.

Нормативная продолжительность строительства Объекта – 12,2 мес., ввод в эксплуатацию – III квартал 2015 года.

**Застройщиком получены:**

- Решение Мингорисполкома от 22 августа 2013 года №2081.

- свидетельство (удостоверение) №500/973-2252 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав, ограничений (обременений) на него, свидетельство (удостоверение) №500/973-2253 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав, ограничений (обременений) на него, расположенных по адресу: г. Минск, пер. Инструментальный, 11а.

- Экспертное заключение РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗЫ» от 14.06.2013 года №05-03/4269;

- Разрешение Инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску №2-206Ж-045/13 от 04.03.2015 г.

**Договор строительного подряда** № 09/09.2013 от 09.09.2013 г. с ООО «СК-12».

Жилой дом расположен в Первомайском районе г. Минска по пер. Инструментальному, 11а на 70 квартир – односекционный, двенадцатиэтажный, с подземным гаражом-стоянкой на 35 машино-мест, запроектирован с теплым чердаком, плоской кровлей, с двумя пассажирскими лифтами. Вентиляция в квартирах – естественная. Конструктивная схема зданий – монолитный каркас с заполнением поризованным кирпичом. Наружная отделка решена на основе применения современных отделочных материалов и конструкций.

Сведения о благоустройстве: озеленение, устройство дорожных покрытий, благоустройство прилегающей территории.

Этажность – 12. Площадь жилого здания – 5583,60 кв.м. Общая площадь квартир – 4604,18 кв.м. Общая площадь гаража-стоянки 1037,66 кв.м.

Всего в доме 70 квартир, из них для привлечения к строительству по договорам создания объектов долевого строительства дольщиков – **граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий для заключения договоров долевого строительства**:

Однокомнатных общей площадью от 44,76 до 46,04 кв.м – 3 квартиры. Цена 1 кв.м – 31 160 000 руб.

Все квартиры имеют летние помещения (лоджии).

Общее имущество, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков:

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, ненесущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию зданий.

Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить в офисе УП «КАНИМИС» по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 10 – 1А. Телефон/факс: 8(017)3060802, 8(017)3060781 с 9.00 до 18.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни: суббота, воскресенье.

---

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Адрес участка/ кадастровый номер | Кадастровый № 14010000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Бехтерева, 71 | 1026644 | 0,1017 | Строительство и обслуживание жилого дома | **104 536 413** | 20 900 000 | **540 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 2* | ул. Бехтерева, 81 | 1027175 | 0,1026 | | **110 669 490** | 22 130 000 | **540 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 3* | ул. Красно-гвардейская, 36 | 1027451 | 0,1185 | | **358 077 375** | 71 610 000 | **2 834 194** | 0,0058 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 0,4 кВ |
| **Дополнительное условие для победителя аукциона:** содержание приобретенной территории в надлежащем техническом и санитарном состоянии (самостоятельно или путем заключения договора со специализированной организацией г. Бреста) | | | | | | | | |
| ***повторные аукционные торги ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ – КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»** | | | | | | | | |

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924**.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. № 881;

• в течение 2 месяцев со дня получения выписки из решения горисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона обратиться за государственной регистрацией права частной собственности на земельный участок;

• приступить к освоению земельного участка в течение 1 года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство).

**Аукцион состоится 11 июня 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 07.05.2015 г. до 17.30 05.06.2015 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www.gki.gov.by**

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# З ЧАГО ЗРАБІЦЬ УГНАЕННІ ДЛЯ АГАРОДА?

**Даўно даказаны той факт, што для добрага росту і развіцця раслін карысней гною можа быць толькі «зялёнае» ўгнаенне. Акрамя таго, што яно не саступае апошняму па ўтрыманні карысных рэчываў і мікраэлементаў і практычна нічога не каштуе, яно яшчэ і абсалютна даступнае — як кажуць, заўсёды пад рукамі.**

У агароднікаў, якія трымаюць у сваёй гаспадарцы птушак і жывёл, вядома, гной заўсёды ёсць. А што рабіць тым, у каго няма такой магчымасці? У гэтым выпадку найлепшымі памочнікамі па ўгнаенні глебы будуць раслінныя рэшткі і харчовыя адходы з кухні.

## Бананавыя пачастункі для таматаў і перцаў

Бананавыя скуркі будуць ідэальным угнаеннем для маладой расады таматаў і перцаў. Іх можна нарыхтоўваць на працягу ўсёй зімы, высушваючы на батарэі, у выніку чаго яны змогуць захавацца да самай вясны. За 2-3 дні да высадкі названых культур на пастаяннае месца замачыце скуркі ў вадзе, каб яны трохі размякчыліся, а падчас перасадкі пакладзіце па 2 штукі ў лунку пад кожную расліну, прысыпце сталовай лыжкай попелу, а пасля накрыйце невялікім слоем зямлі і смела «перасяляйце» расаду.

## Бульбяны ласунак для капусты

Бульбу, прызначаную для ўгнаення, перад выкарыстаннем ачысціце, каб выключыць верагоднасць далейшага прарастання, пасля чаго пакладзіце яе ў лунку і пачынайце высаджваць расаду. У хуткім часе бульбачка пачне гніць, у выніку чаго каранёвая сістэма расліны атрымае ўсе карысныя элементы, неабходныя для харчавання і нармальнага развіцця капусты.

## Яечны пачастунак для агароднінных культур

Выдатнай падкормкай для падрослай расады з'яўляецца настой з яечнай шкарлупіны. Робіцца ён проста: трохлітровы слоік на 2/3 запаўняем шкарлупінай і да рыльца заліваем адстаялай вадой. Тры дні чакаем, пасля чаго вадкасць зліваем і паліваем ёю расліны. Так адну і тую ж шкарлупіну у слоіку можна заліваць да трох разоў. Акрамя гэтага, дабаўляйце здробненую яечную шкарлупіну або парашок з яе ў лункі пад расліны.

Добрымі ўгнаеннямі для маладых раслін з'яўляюцца і разнастайныя вадкія падкормкі, асноўнымі кампанентамі якіх з'яўляюцца не толькі раслінныя рэшткі, але і чэрствы хлеб, скіслае малако з кефірам і нават зацукраванае варэнне.

## Падкормкі з крапівы

У пачатку лета, калі маладой крапівы дастаткова, збярыце і напоўніце ёю любую ёмістасць (бочку, вядро), потым заліце вадой і накрыйце, каб пачаўся працэс закісання. Праз пяць дзён змесціва пачне пузырыцца, значыць, падкормка гатова. Працадзіце настой, развядзіце яго вадой у суадносінах 1:10 і выкарыстоўвайце для паліву раслін хоць кожны тыдзень, калі, вядома, не лянуецеся. Дарэчы, выкідаць «адпрацаваную» крапіву не варта — яна будзе ідэальным сродкам для мульчыравання маладых дрэў.

## Настой па прынцыпе ЭМ-тэхналогій

Напоўніце бочку такімі карыснымі раслінамі, як дзьмухавец, падбел, падтыннік, крапіва і г.д., заліце вадой і дабаўце 1 л пракіслага малака, кефіру, сыроваткі або непатрэбнага варэння. Пасля гэтага, каб выключыць доступ паветра, накрыйце яе поліэтыленам, і праз тыдзень ваш ЭМ-настой будзе гатовы. Працадзіце яго, развядзіце ў вадзе з разліку 1:10 і выкарыстоўвайце падчас паліву раслін.

# ЯК ПАЗБАВІЦЦА АД ПЫРНІКУ ЗА АДЗІН СЕЗОН?

**Пырнік старажытныя рымляне называлі «агонь палёў». Справіцца з ім вельмі няпроста. Тым больш за адзін сезон. Ёсць некалькі варыянтаў.**



## Капаць, капаць і капаць

Многія пачынаюць перакопваць участак, выбіраючы карані пырніку. Але кавалачкі каранёў усё ж часам застаюцца і потым прарастаюць з новай сілай. Іх, вядома, лягчэй выдзіраць, бо грунт ужо распушаны, а карэньчыкі невялікія. Але калі не выкапаць іх своечасова, даць ім падужэць, пырнік вокамгненна распаўзаецца зноў. Ды і апрацаваць такім спосабам 20 сотак...

## Сеем жыта

Добры варыянт — пераараць участак і засеяць жытам. Жыта выцясняе пырнік, і гэта даказаны факт. Падрослы злак скасіць і зааараць у глебу. І барацьба з пырнікам, і паляпшэнне структуры глебы, і яе ўзбагачэнне арганікай — тры ў адным атрымліваецца.

## Усё пад плёнку

Вельмі дзейсны спосаб — закрыць пырнік непразрыстай чорнай плёнкай на ўвесь сезон. Праўда, выдаткова, але тут ужо трэба выбіраць. Мульчыраванне чорнай плёнкай рэкамендавана нават для барацьбы з такім жывучым і невыкараняльным пустазеллем, як баршчэўнік. Эфектыўнасць пацверджана эксперыментальна. Участак, зарослы травой у чалавечы рост (і пырнік, і палын, і асот, і шмат яшчэ чаго), заслалі чорнай плёнкай, і так ён стаяў цэлы год. Пасля плёнку прыбралі, а зямлю перааралі. Вынік уражвае: роўны ўчастак, друзлая, рассыпістая глеба без следу пустазелля.

Ёсць і такі вопыт. Чорнай плёнкай накрылі пляцоўку (па цаліне) пад парнік. Плёнка ляжала з красавіка па чэрвень — пустазелле на гэтым месцы да восені не з'явілася.

Ёсць нюансы. Па-першае, пажадана ўжываць менавіта плёнку, а не чорны спанбонд. Спанбонд прапускае ваду, не перашкаджае паветраабмену, так што моцнаму пустазеллю (а пырнік слабым не назавеш) цалкам рэальна выжыць. Тым больш, якасць многіх матэрыялаў такога кшталту пакідае жадаць лепшага: нават пры заўленай выtворцам высокай шчыльнасці, палатно можа мець нераўнамерную структуру і часткова прапускаць святло. Тады яго эфектыўнасць зусім невысокая. Плёнку лепш слаць так, як яна ёсць — «рукавом», не разразаючы, а значыць, у два слаі. Гэта памяншае верагоднасць пашкоджвання. Двайная плёнка абыдзецца даражэй, але будзе больш надзейнай.

Абавязкова трэба добра зафіксаваць краі, каб іх не падымала трава і вецер не здзімаў плёнку. Пакрыццё варта раўнамерна замацаваць якімі-небудзь грузамі. Падыдуць і цагліны, і камяні, і цяжкія дошкі або бярвёны, і проста мяшкі з грунтам або пяском.

Дарэчы, можна ж і камбінаваць метады: падзяліць плошчу на часткі і выпрабаваць усе варыянты. А потым параўнаць эфектыўнасць.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.22 | 20.51 | 15.29 |
| Віцебск — | 5.07 | 20.46 | 15.39 |
| Магілёў — | 5.12 | 20.41 | 15.29 |
| Гомель — | 5.15 | 20.32 | 15.17 |
| Гродна — | 5.39 | 21.05 | 15.26 |
| Брэст — | 5.45 | 21.00 | 15.15 |

**Месяц**

*Поўня 4 мая.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

**Імяніны**

**Пр.** *Елізаветы, Аляксандра, Аляксея, Валянціна.*
**К.** *Людмілы, Ружы, Вінцэнта.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— А ў мяне таксама дзясяткі паспяховых скачкоў!
— Парашутыст?
— Не! Вопытны палюбоўнік!

**Пракурор:**
**— Падсудны здзейсніў злачынства, рэдкае па смеласці, спрыту і багацці фантазіі!**
**Падсудны:**
**— Няма чаго мяне хваліць, я ўсё роўна не прызнаюся!**

Мужыкі, гэта працуе! Сказаў жонцы: «Дарагая, пераключы канал, там пачынаецца твой любімы серыял». А яна адказала: «Не камандуй!» і праз шкоднасць працягнула глядзець са мной футбол!




## Здарэнне

# КРАН НЕ ПУСЦІЛІ ЗА МЯЖУ

Яго спрабаваў вывезці 27-гадовы жыхар Мазыра. Але ў раёне Мсціслава на мяжы з Расіяй грузавы «Мерседэс», якім ён кіраваў, спынілі праваахоўнікі. І, як высветлілася, не беспадстаўна.

Пры праверцы аказалася, што на вежавы кран, які вёз мужчына, няма ніякіх суправаджальных дакументаў. Ён быў набыты ў Беларусі, адрамантаваны і прызначаўся для продажу ў Расійскай Федэрацыі. Нелегальны тавар коштам 170 мільёнаў рублёў канфіскаваны. Маладому чалавеку пагражае штраф у памеры да 50 базавых велічынь.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**ДА ДНЯ ПЕРАМОГІ**

У дзень юбілею нашай Перамогі віншую з урачыстым святам ветэранаў вайны і працы былога калгаса «Новы шлях», усіх хлебаробаў сённяшняга СВК (вёска Навасёлкі). Няхай вам усім радасна жывецца пад мірным небам на роднай зямлі, а шчасце назаўсёды застаецца ў кожным вясковым доме другім сонейкам. А яшчэ жадаю трывалага здароўя, упэўненасці ў заўтрашнім дні, прыбаўлення немаўлятак у сем'ях нашых вяскоўцаў, вашага даўгалецця!

***Аляксандр ВАШЧУК, старшыня праўлення СВК «Шлях новы» Ляхавіцкага раёна***

УНП 200058085

**Аж да 100 гадоў!**

Са святам Перамогі, шаноўныя ветэраны вайны і працы пасляваеннага калгаса «Памяць Ільіча», а сённяшняга СВК! Жадаю ўсім вам, а таксама хлебаробам сельгаспрадпрыемства і нашага прыбужскага раёна, веснавога настрою і дабрабыту ў сем'ях, новых дасягненняў на палетках і фермах, будаўнічых пляцоўках, трывалага здароўя і даўгалецця аж да ста гадоў!

***З павагай, Аляксей Сцяпанавіч СКАКУН, старшыня СВК «Астрамечава», Ганаровы грамадзянін Брэсцкага раёна***

УНП 200035478

**Мацнее Айчына з вамі наша...**

Прысвячаецца шаноўным ветэранам вайны і працы нашага сельгаспрадпрыемства

*Дзякуй вам за Перамогу,*
*За дні шчаслівыя для нас,*
*За мір, шырокую дарогу*
*Да родных ніў у светлы час.*

*Няхай вам праўнук*
*усміхнецца,*
*Прыбавіць радасці, гадоў;*
*Жадаем вам яшчэ, канечне ж,*
*Здароўя, моцы, бы ў дубоў.*

*Вам сёння тое ж шчыра скажа*
*Вясковец кожны ад радні:*
*— Мацней Айчына*
*з вамі наша,*
*Святлей у святы*
*з сонцам дні.*

***Адміністрацыя і прафкам ААТ «Айчына» Пружанскага раёна***

УНП 200026258

**Віншуем ветэранаў вайны і працы, усіх хлебаробаў сельгаспрадпрыемства са святам Перамогі, а яго маладога кіраўніка ПЕСНЯКА Аляксандра Анатольевіча яшчэ і з днём нараджэння!**

Жадаем усім блакітнага неба над галавой, сямейнага шчасця і спакойнага даўгалецця.

***Адміністрацыя і прафкам ААТ «Ліноўскае» Пружанскага раёна.***

УНП 200026975




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.007. Індэкс 63850. Зак. № 1725.

Нумар падпісаны ў 19.30 6 мая 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12